ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ПЯТНІЦА, 27 СТУДЗЕНЯ 1939 г. № 5 (419) ЦАНА 20 КАП.

# ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР



21 студзеня у Дзяржаўным Акадэмічным ордэна Леніна Вялікім тэатры Саюза ССР адбылося жалобнае пасяджэнне, прысвечанае 15 гадавіне з дня смерці Владзіміра Ільіча ЛЕНІНА.
НА ЗДЫМКУ: У прэзідыуме жалобнага пасяджэння. Злева направа: таварышы БУЛГАНІН, ЕЖОЎ, БЕРЫЯ, МІКАЯН, КАГАНОВІЧ, ШЧЭРБАКОЎ, АНДРЭЕЎ, СТАЛІН, ДЗІМІТРАЎ, КАЛІНІН, МОЛАТАЎ, БУДЗЕННЫ, ЖДАНАЎ, БАДАЕЎ і ВАРАШЫЛАЎ.

Фотахроніка ТАСС.

## МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАННЕ — ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА

Прайшло звыш двух месяцаў з часу апублікавання пастановы Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Гэта пастанова, якая знамянуе сабою новы ўздым у ідэйным жыцці краіны, з'яўляецца дэтальна распрацаванай праграмай арганізацыі бальшэвіцкай прапаганды. У гэтай пастанове ЦК ВКП(б) падкрэсліў, як першачарговую і важнейшую задачу партыі — задачу марксісцка-ленінскага выхавання совецкай інтэлігенцыі.

Пастанова ЦК ВКП(б) указвае, што асновай партыйнай прапаганды павінна быць глыбокае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» — падручніка, які дае навуковы выклад асноў марксізма-ленінізма і асвятляе ўвесь вопыт барацьбы бальшэвіцкай партыі, — падручніка, які з'яўляецца для ўсіх нашых кадраў магутнейшай зброяй у барацьбе за перамогу камунізма.

Што-ж зроблена за прайшоўшы з дня апублікавання пастановы ЦК ВКП(б) час па арганізацыі партыйнай прапаганды ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў і ў калектывах работнікаў мастацтваў БССР?

На гэта пытанне можна даць толькі адзін адказ: недапушчальна мала. Партыйныя арганізацыі гэтых калектываў яшчэ не забяспечылі належнага разгортвання партыйнай прапаганды ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б).

Партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў за гэты час толькі... падлічыла, што з 12 членаў партыі ні адзін яшчэ не прачытаў нават падручніка па гісторыі ВКП(б) і што толькі асобныя беспартыйныя пісьменнікі, як Я. Колас, З. Бядуля, К. Крапіва, пачалі глыбокае самастойнае вывучэнне гісторыі партыі. Професаюзная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў зусім ухілілася ад работы па ажыццяўленню пастановы ЦК ВКП(б). Партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў належным чынам не растлумачыла ўсім партыйным і непартыйным пісьменнікам, усім супрацоўнікам апарата саюза пастанову ЦК ВКП(б) і выключнае палітычнае значэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», як асноўнага сродку ліквідацыі тэарэтычнай адсталасці нашых кадраў. У выніку гэтага многія пісьменнікі яшчэ не прыступілі да вывучэння гісторыі ВКП(б). Нічога не зроблена і па дапамозе тым, хто распачаў вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Час рашуча асудзіць і ліквідаваць гэту шкодную бяспечнасць у справе ажыццяўлення пастановы ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды.

У Саюзе совецкіх мастакоў створан гурток па вывучэнню гісторыі партыі, але гурток гэты работу не распачаў. Нават тым мастакам, якія самастойна вывучаюць гісторыю ВКП(б), ні парторг, ні праўленне саюза ніякай дапамогі не аказваюць. Фактычна мастакі ў асноўнай сваёй масе да вывучэння гісторыі партыі не прыступілі.

У калектывах тэатраў — маруднасць у арганізацыі партыйнай прапаганды і часам простая бяздзейнасць.

Трэба сказаць, што недастатковую ўвагу справе партыйнай прапаганды ў калектывах тэатраў удзяляюць і райкомы і гаркомы КП(б)Б. А яны павінны, улічваючы асаблівасць работы ў тэатрах — занятасць у вячэрні час, дапамагчы тэатральным калектывам арганізацыяй спецыяльнай кансультацыі для вывучаючых гісторыю партыі.

І ў Тэатры оперы і балета, і ў драматычных тэатрах, і ў Філармоніі партыйныя, комсамольскія арганізацыі і мясцкомы профсаюзаў дагэтуль не разгарнулі патрэбнай ідэйна-палітычнай работы, накіраванай на ажыццяўленне пастановы ЦК ВКП(б).

Між тым, асобныя перадавыя работнікі літаратуры і мастацтва, як народны паэт Я. Колас, засл. дзеяч мастацтваў З. Азгур, нар. арт. рэсп. А. Ільінскі, засл. арт. рэсп. П. Малчанаў, кампазітар, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР А. Багатыроў і многія іншыя паказваюць добрыя прыклады работы па аўладанню марксізмам-ленінізмам. На аснове гэтага яны дасягнулі і значных творчых поспехаў.

Майстры слова, кісці, сцэны — работнікі літаратуры і ўсіх галін мастацтваў павінны глыбока зразумець, што толькі аўладанне бальшэвізмам, веданне тэорыі марксізма-ленінізма, перамаганне сваёй тэарэтычнай адсталасці адкрывае шырокія перспектывы для творчага росту, стварэння выдатных мастацкіх вобразаў і твораў і з'яўляецца асноўнай умовай паспяховай барацьбы з рэшткамі фармалізма і натуралізма, барацьбы за ўрачыстасць у мастацтве соцыялістычнага рэалізма.

Партыйныя арганізацыі павінны стварыць усе ўмовы для хутчэйшага перамагання нашай інтэлігенцыяй сваёй тэарэтычнай і палітычнай адсталасці.

Абсталяваць і адкрыць спецыяльныя пакоі для самастойнай работы, укамплектаваць бібліятэкі патрэбнай марксісцка-ленінскай літаратурай, забяспечыць кваліфіцыраваную кансультацыйную дапамогу, чула прыслухоўвацца да патрабаванняў партыйных і непартыйных совецкіх інтэлігентаў, клапатліва дапамагаючы ім у ідэйна-палітычным росце, — абавязак партыйных і професаюзных арганізацый.

ЦК ВКП(б) у сваёй пастанове рашуча асудзіў «як дзікасць і хуліганства пагардлівыя адносіны да совецкай інтэлігенцыі і да задач яе ідэйна-палітычнага выхавання ў духу марксізма-ленінізма». І трэба рашуча, да канца і назаўсёды ліквідаваць рэшткі гэтых антыленінскіх, «махаеўскіх» адносін, што знаходзяць сваё выражэнне яшчэ і зараз у запушчанасці ідэйна-выхаваўчай работы ў калектывах работнікаў мастацтваў, у адсутнасці належнай пастаноўкі партыйнай прапаганды і дапамогі кадрам нашай інтэлігенцыі пачаць сур'ёзнае, глыбокае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», авалоданне тэорыяй марксізма-ленінізма.

Зараз работнікі літаратуры і мастацкага фронта Совецкай Беларусі вырашаюць надзвычай складаныя і адказныя творчыя задачы. Пісьменнікі працуюць над новымі творамі прозы, паэзіі, драматургіі, якія адлюструюць нашае вялікае сёння, сонечныя дні соцыялізма, квітненне нашай зямлі і магутнасць совецкага народа. Мастакі рыхтуюць выстаўку на тэму: Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці. Работнікі тэатральнага мастацтва разам з драматургамі і ўсёй нашай грамадскасцю рыхтуюцца да сур'ёзнага экзамена — да паказу беларускага мастацтва на дэкадзе ў Маскве.

Гэтыя надзвычай пачэсныя і складаныя задачы, якія знамянуюць новы ўздым і росквіт нашай соцыялістычнай культуры, павінны быць бліскуча вырашаны.

Вырашэнне іх патрабуе ўстанаўлення жалезнай працоўнай дысцыпліны, бязлітаснай барацьбы з дэзарганізатарамі соцыялістычнай працы.

Вырашэнне іх проста і непасрэдна залежыць ад бальшэвіцкага загартавання кадраў нашай інтэлігенцыі, узбраення іх тэорыяй марксізма-ленінізма.

«Авалодваючы тэорыяй марксізма-ленінізма, якая ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця, нашы кадры стануць сапраўды непераможнымі і яшчэ больш паспяхова павядуць пад сцягам гэтай тэорыі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна ўвесь совецкі народ да перамогі камунізма». (З пастановы ЦК ВКП(б) аб пастаноўцы партыйнай прапаганды).

Партыйныя і непартыйныя совецкія інтэлігенты павінны бальшэвіцкай барацьбой за ідэйна-палітычнае ўзбраенне, за новыя выдатныя творчыя поспехі нашай літаратуры і нашага соцыялістычнага мастацтва адказаць на выключныя клопаты і ўвагу, якія ўдзяляюць совецкай інтэлігенцыі бальшэвіцкая партыя і вялікі Сталін.

## У ПРЭЗІДЫУМЕ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР арганізацыйныя камітэты ЦВК БССР па Віцебскай, Гомельскай, Менскай, Магілеўскай і Палескай абласцях пераіменаваны ў арганізацыйныя камітэты Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

(БЕЛТА).

*ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ*

## БОЛЬШ УВАГІ ТВОРЧАЙ РАБОЦЕ

Справаздача парторга Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР тав. М. Лынькова на партыйным сходзе, які адбыўся 22 студзеня, доўжылася каля двух гадзін. Тав. Лынькоў расказаў сходу аб рабоце партарганізацыі ў часе выбараў у Вярхоўны Совет БССР і падрыхтоўкі да дваццацігоддзя БССР. Ен гаварыў аб рабоце з пачынаючымі пісьменнікамі, аб значэнні дзяжурстваў членаў праўлення саюза.

Пераходзячы да раздзелу партыйнай работы, парторг заявіў, што «пахваліцца значнымі поспехамі ў гэтай галіне нельга». Партсходы падрыхтоўваюцца дрэнна, комуністы не знаюць абвесткі дня чарговага схода. Не арганізавана яшчэ па-сапраўднаму партыйная вучоба, вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Кансультацыі і лекцыі Дома партактыва наведваюцца толькі двума таварышамі. Слаба разгорнута работа па прыёму ў партыю — прынята ў кандыдаты партыі адна толькі тав. Агняцвет. Не гледзячы на неаднаразовыя пастановы партарганізацыі, не арганізавана яшчэ група спачуваючых. У дрэнным становішчы партыйная гаспадарка арганізацыі, асабліва пратаколы партсходаў.

Вельмі мала зроблена партарганізацыяй у галіне наладжвання працоўнай дысцыпліны ва ўстановах Саюза пісьменнікаў. Слаба працуюць професаюзная і грамадскія арганізацыі саюза — Асоавіяхім, МОПР, саюз бязбожнікаў. Некаторых поспехаў партарганізацыя дасягнула толькі ў кіраўніцтве комсамолам.

Асноўны недахоп справаздачы тав. Лынькова — адсутнасць глыбокага аналізу творчай работы саюза і творчасці комуністаў-пісьменнікаў у першую чаргу. Гэта невыпадкова. Партарганізацыя на сваіх сходах не ставіла творчых дакладаў і не абмяркоўвала асобных твораў пісьменнікаў. Занадта агульна гаварыў тав. Лынькоў і аб выкананні пастаноў справаздачна-выбарчага схода і іншых сходаў партарганізацыі.

Аб недахопах даклада і рабоце партарганізацыі за справаздачны перыяд гаварылі ў спрэчках усе ўдзельнікі схода.

Пра становішча партвучобы ў арганізацыі расказаў тав. Бутэлін. Гаворачы аб тым, што яшчэ мала таварышоў звяртаецца за кансультацыяй па гісторыі ВКП(б), тав. Бутэлін прывёў факты, якія паказваюць, што некаторыя таварышы яшчэ не зразумелі вялікага значэння вывучэння гісторыі партыі (напрыклад, тав. Фінкель).

Аб уласнай рабоце па аўладанню марксізмам-ленінізмам расказаў тав. Гусеў.

Тт. Гусеў і Мазо крытыкавалі парторга за адсутнасць праверкі выканання партыйных даручэнняў. Яны гаварылі пра тое, што дысцыпліна ў арганізацыі не заўсёды знаходзіцца на належным узроўні.

Аб літаратурных справах гаварылі тт. Клімковіч, Гурскі, Модэль і Стаховіч. Партарганізацыя мала кіравала работай пісьменнікаў і крытыкаў у справе напісання гісторыі літаратуры. Журнал «Полымя рэволюцыі» выходзіць з друку з вялікім спазненнем. Бяздзейнічае клуб пісьменнікаў, сродкі, асігнаваныя Літфондам на клубную работу, не скарыстоўваюцца. Праблемы літаратурнай спадчыны і мовы выпалі з поля зроку партарганізацыі.

Тт. Вітаўтаў і Кунькоў гаварылі пра неабходнасць большай увагі да членаў арганізацыі, якія не з'яўляюцца пісьменнікамі, пра неабходнасць большай шчырасці і прынцыповасці ў адносінах пам'ж асобнымі таварышамі.

У Саюзе совецкіх пісьменнікаў і партыйнай арганізацыі доўгія годы арудавалі заклятыя ворагі народа. Яны выкрыты і разгромлены органамі НКВД пад кіраўніцтвам партыі. Адзначаючы гэта, таварышы правільна завайстрылі ўвагу на шкоднасці самазаспакоенасці, на неабходнасці хутчэйшай ліквідацыі вынікаў варожай работы, якая вялася ў Саюзе пісьменнікаў трацкісцка-бухарынскімі і нацыянал-фашысцкімі бандытамі і шпіёнамі.

Н. К.

## ЗА АВАЛОДАННЕ БОЛЬШЭВІЗМАМ

Пасля першага з'езда мастакоў БССР мінула паўтара месяца. За гэты час ні партыйная група, ні праўленне Саюза мастакоў нічога не зрабілі для таго, каб наладзіць работу па палітычнаму выхаванню мастакоў. Не праведзена ні адной лекцыі ў дапамогу мастакам, якія вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

— Працуе гурток па вывучэнню гісторыі ВКП(б), — сцвярджае парторг саюза тав. Гаўрыленка. Але што гэта за гурток? Па-першае, гурток ахоплівае адну нязначную групу членаў саюза, якія навучаюцца ў ізостудыі, а, па-другое, — гурток за апошнія два месяцы ні разу не збіраўся. Парторг тав. Гаўрыленка нічога не робіць для таго, каб наладзіць работу па вывучэнню гісторыі ВКП(б).

Абмежавацца толькі гуртковымі заняткамі — нельга. Асноўны метад вывучэння гісторыі партыі — метад індывідуальнага вывучэння. Партыйная група і праўленне Саюза мастакоў павінны арганізаваць у дапамогу мастакам, якія вывучаюць гісторыю ВКП(б) індывідуальна, неабходную кансультацыю па асобных раздзелах і пытаннях гісторыі партыі і рад лекцый па першакрыніцах марксізма-ленінізма.

Многія мастакі да вывучэння курса гісторыі партыі яшчэ не прыступалі. Толькі асобныя таварышы — М. Манасзон, З. Азгур і М. Керзін прыступілі да вывучэння гісторыі ВКП(б).

Працуючы над эскізам новай карціны аб барацьбе беларускага народа з нямецкімі акупантамі, тав. Манасзон пачаў вывучэнне падручніка па гісторыі ВКП(б) і азнаямленне з шматлікімі архіўнымі матэрыяламі. Гэта добра. Толькі глыбокае веданне гістарычных фактаў, уменне палітычна правільна аналізіраваць гэтыя факты дапамогуць мастаку стварыць праўдзівую мастацкую карціну.

Галіна мастацкай творчасці выключна адказная, яна патрабуе рознабаковай падрыхтоўкі мастака. Засл. дзеяч мастацтваў тав. Керзін правільна патрабуе разам з вывучэннем гісторыі партыі паставіць пытанне аб вывучэнні марксісцкіх поглядаў на задачы соцыялістычнай эстэтыкі ў мастацтве. Гэта галіна надзвычай важная. Зразумела, што шлях да разумення эстэтыкі соцыялістычнай эпохі ляжыць перш за ўсё праз палітычнае выхаванне мастака ў духу марксізма-ленінізма, але побач з гэтым мастак павінен добра разбірацца і ў спецыфічных пытаннях эстэтыкі.

Зараз мастакі Совецкай Беларусі рыхтуюцца да выстаўкі 1940 года, прысвечанай 20 гадавіне вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Работа над мастацкімі творамі для гэтай выстаўкі, якая павінна паказаць ролю таварыша Леніна і Сталіна як арганізатараў беларускай дзяржаўнасці, патрабуе ад беларускіх мастакоў вялікага майстэрства і палітычнай спеласці. Глыбокае вывучэнне гісторыі ВКП(б) можа аказаць беларускім мастакам ва ўсёй гэтай складанай рабоце па падрыхтоўцы да мастацкай выстаўкі выключную дапамогу. Трэба толькі, каб ва ўсёй гэтай рабоце па палітычнаму выхаванню мастакоў аказаў неабходную дапамогу і Менскі гарком партыі, які да апошняга часу не ўдзяляў адпаведнай увагі палітычнаму выхаванню работнікаў выяўленчага мастацтва.

А. ДАЛІН.

## АБ ПРЫЁМЕ НА РАБОТУ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ, ЗВОЛЕНЫХ ЗА ПРАГУЛ

У сувязі з запросамі з месц СНК Саюза ССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС растлумачваюць, што рабочыя і служачыя, зволеныя за прагул, не могуць прымацца на работу ў тое-ж прадпрыемства ці ўстанову на працягу трох месяцаў, але яны могуць быць неадкладна прыняты ў іншыя прадпрыемствы ці ўстановы. І ў тым і ў іншым выпадку яны могуць быць прыняты на работу толькі ў парадку, прадугледжаным пастановай СНК Саюза ССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС ад 28 снежня 1938 года «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны», згодна якой зволеныя за прагул трацяць свой бесперапынны стаж і звязаныя з ім правы і перавагі, прычым пры паступленні на тое-ж ці іншае прадпрыемства або ўстанову яны разглядваюцца, як усякі, упершыню паступаючы на работу, не маючы стажа работы.

(ТАСС).

## КУЛЬТУРА СПЕКТАКЛЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Пастанова СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС аб умацаванні працоўнай дысцыпліны з'яўляецца магутным стымулам для далейшага росту дабрабыту нашай квітнеючай краіны.

Несучы ганаровае званне совецкага актора, мы павінны быць прыкладам дысцыплініраванасці, акуратнасці і чоткасці ў рабоце. Не можа быць месца сярод нас тым, хто дазваляе сабе парушаць працоўную дысцыпліну няяўкай ці спазненнем на спектакль. Кожны спектакль для актора — гэта новая светлая, яркая старонка ў яго творчым жыцці. Няма большага пачуцця радасці і здавальнення ў нашай акторскай рабоце, як радасць выступаць перад тысячнай аудыторыяй, якая вельмі чула ўспрымае і цэніць нашу працу, наша совецкае мастацтва.

Вядома, спазненне на рэпетыцыю ёсць грубае парушэнне працоўнай дысцыпліны, — гэта ясна. Але не менш перашкаджаюць рабоце і тыя, хто хоць і своечасова прыходзіць на рэпетыцыю, але прыходзіць непадрыхтаваным, без хатняй прапрацоўкі ўсяго вобраза, і тым самым перашкаджае ў рабоце, затрымлівае работу сваіх партнёраў і рэжысуры. У часе рэпетыцый некаторыя таварышы захапляюцца рознымі размовамі, не маючымі ніякага дачынення да мастацтва, не цікавяцца сцэнамі, у якіх яны не заняты, а з-за гэтага часам бывае так, што некаторыя сцэны для іх з'яўляюцца сюрпрызам к генеральнай рэпетыцыі, а то і к самай прэм'еры. Я лічу парушэннем працоўнай дысцыпліны і тое, што актор ці актрыса дазваляюць сабе часам залішнія вольнасці і абыякавасць на сцэне, асабліва ў масавых сцэнах.

Спазненне на выхад цалкам залежыць ад самога актора. Калі ён, знаходзячыся за кулісамі, у акторскім пакоі, абыякава адносіцца да таго, што адбываецца на сцэне, — дык яго выхаду грош цана; паяўленне яго на сцэне будзе непраўдзівым, бутафорскім, і публіка яму не паверыць. Шум, староннія размовы, якія не датычаць справы — як за кулісамі, так і ў акторскіх пакоях, — вельмі перашкаджаюць рабоце і парушаюць цэласнасць і якасць спектакля.

У тэатры ўсё павінна быць падпарадкавана спектаклю, пачынаючы ад галоўнай яго дзеючай асобы — актора і канчаючы білецёрам, які першым сустракае нашага гледача.

Мы павінны імкнуцца да таго, каб нашы спектаклі з цягам часу не гублялі сваіх якасцей, а заўсёды былі-б мастацка поўнакаштоўнымі. Парукай гэтаму можа служыць толькі цвёрдая дысцыпліна ўсяго калектыва і павышэнне акторскага майстэрства.

Перад намі, работнікамі мастацтваў БССР, цяпер стаіць вялікая, адказная палітычная і творчая задача — падрыхтоўка да паказу беларускага мастацтва на дэкадзе ў Маскве. І гэта яшчэ ў большай ступені абавязвае нас быць патрабавальнымі да сябе і да тых людзей, якія парушаюць працоўную дысцыпліну, перашкаджаючы і тармозячы далейшы рост нашага соцыялістычнага мастацтва.

В. О. ВЛАДАМІРСКІ.
Народны артыст БССР.

## ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б
## АБ ПАКЛЁПНІЦКА-ПРАВАКАЦЫЙНЫХ ДЗЕЯННЯХ ЗЕМЦАВА Д. Я.

Праведзенай, па рашэнню Бюро ЦК КП(б)Б ад 5 студзеня 1939 года, праверкай дзеянняў Земцава Д. Я. у Бялыніцкім і Рудзенскім раёнах, устаноўлена:

1. Земцаў Д. Я., атрымаўшы даручэнне ад ЦК КП(б) Беларусі 20 снежня 1937 г. расследваць апублікаваныя карэспандэнцыі ў газеце «Звязда», па Бялыніцкаму раёну, пад загалоўкам «Ачысціць Бялыніцкі раён ад ворагаў», ад 18 снежня 1937 г., і па Рудзенскаму раёну — «Варожае дзеянне», ад 27 верасня 1937 г., замест стараннага і аб'ектыўнага расследвання ўсіх пералічаных у артыкулах фактаў, узяў пад сумненне партыйнае кіраўніцтва і, карыстаючыся правакацыйнымі метадамі, дабіўся на раённых партыйных сходах прыняцця рашэнняў аб выражэнні палітычнага недавер'я ўсяму раённаму кіраўніцтву і выключэнні з партыі сакратароў гэтых райкомаў тт. Плетнёва і Рымша, з фармуліроўкай «як ворагі народа». Больш таго, у гэты-ж дзень, не маючы на тое ніякага права і падстаў, Земцаў абавязаў начальніка РА НКВД Бялыніцкага раёна арыштаваць тав. Рымшу.

2. Далей, Земцаў заявіў, што рудзенская партарганізацыя моцна засмечана і трэба не менш 50 проц. усіх комуністаў выключыць з партыі. Стварыўшы сярод комуністаў абстаноўку ўзаемнага недавер'я і дэзарганізаваўшы работу ўсёй райпартарганізацыі, Земцаў прыступіў да масавых неабгрунтаваных выключэнняў з партыі. Земцаў выклікаў да сябе членаў райкома і кожнаму з іх уручыў спісак комуністаў і абавязаў у гэты-ж дзень правесці партыйныя сходы пярвічных арганізацый і ўказаных у спіску комуністаў выключыць з партыі, а партбілеты здаць яму.

Такім чынам, Земцаву ўдалося ўзвесці паклёп і выключыць з радоў КП(б)Б «як ворагаў народа і іх пасобнікаў», па Рудзенскаму раёну 17 чал., па Бялыніцкаму раёну 6 чал. Усе гэтыя таварышы, як чэсныя і адданыя людзі, зараз аднаўлены ў правах членаў і кандыдатаў партыі.

3. У Рудзенскім раёне Земцаў фактычна ліквідаваў раённы камітэт партыі. Адабраў у астаўшыхся членаў райкома ключы ад райкома, адабраў пячаць райкома і, апячатаўшы будынак, выехаў з раёна. Толькі пасля ад'езду Земцава астаўшыяся члены райкома аднавілі партыйны апарат.

4. Земцаў у партыйных дакументах і ў сваёй біяграфіі скрываў ад партыі, што ён у 1933 г. партыйнай камісіяй пры Палітычным упраўленні Кіеўскай Военнай Акругі быў выключан з партыі з фармуліроўкай: «За бескантрольнасць у рабоце, за прысваенне кантрабандных рэчаў, за разлажэнне і за тое, што сваімі ўчынкамі дэзарганізаваў работу і па сутнасці здрадзіў інтарэсам Совецкай краіны», і толькі на Бюро ЦК КП(б)Б, 19 студзеня 1939 г., выкрыты дакументамі, вымушан быў прызнацца.

Бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Земцава Дзмітрыя Якаўлевіча, члена ВКП(б) з 1918 года, — партбілет № 2821978, — за масавыя, неабгрунтаваныя, пры дапамозе паклёпу і правакацый, выключэнні чэсных комуністаў з партыі ў Бялыніцкім і Рудзенскім раёнах, як не заслугоўваючага ніякага давер'я партыі, — з партыі выключыць.

За паклёпніцкія, правакацыйныя дзеянні прыцягнуць да судовай адказнасці.

2. Даручыць рэдактарам газет «Советская Белоруссия» і «Звязда» без замаруджвання і поўнасцю на старонках друку рэабілітаваць усіх аднаўленых у партыі таварышаў з Рудзенскага і Бялыніцкага раёнаў, матэрыялы аб якіх змяшчаліся ў газетах.

ЦК КП(б)Б.

# СПРАВА ЛЕНІНА ПЕРАМАГЛА!

## *Даклад тав. А. С. ШЧЭРБАКОВА, 21 студзеня 1939 года, на жалобным пасяджэнні ў Вялікім тэатры, прысвечаным XV гадавіне з дня смерці В. І. Леніна*

Таварышы! Пятнаццаць год назад перастала біцца сэрца вялікага Леніна. Памёр геній рэволюцыі, той, хто без страху і смела вёў рускі рабочы клас ад рэволюцыі да рэволюцыі.

У звароце «Да партыі. Да ўсіх працоўных» ЦК партыі паведамляў:

«Памёр чалавек, пад баявым вадзіцельствам якога наша партыя, акутаная парахавым дымам, уладарнай рукой устанавіла чырвоны сцяг Кастрычніка па ўсёй краіне, змяла супраціўленне ворагаў, уцвярдзіла трывала панаванне працоўных у былой царскай Расіі. Памёр аснавальнік Комуністычнага Інтэрнацыянала, правадыр сусветнага комунізма, любоў і гордасць міжнароднага пралетарыята, сцяг прыгнечанага Усхода, глава рабочай дыктатуры ў Расіі».

Смерць Леніна аплаквала ўся працоўная наша краіна.

Увесь свет працоўных і прыгнечаных апрануўся ў жалобу.

Смутак усяго працоўнага народа просты самарскі селянін выразіў у такіх словах: «Калі-б можна было пакрыць зямны шар лісточкамі з надпісам «Ленін» у такой колькасці, як гэта імя было сказана ў апошнія дні, гэтыя лісточкі пакрылі-б усе моры і акіяны, мацерыкі і дзебры, і ўсё было-б: Ленін... Ленін...»

Сэрцы ворагаў большэвізма смерць Леніна напоўніла радасцю і надзеяй.

Унутры партыі ўсе тыя, хто і пры жыцці Леніна не раз прабаваў атакаваць партыю знутры, абстраляць яе з тылу, пахіснуць яе рады, усе антымарксісты, антыленінцы, усе тыя, хто, як потым аказалася, стараліся разрушыць партыю і совецкую дзяржаву па заданню замежных разведак, — з новай надзеяй паднялі галаву.

Ворагі пралічыліся. Смерць правадыра не пахіснула радоў партыі. Рабочы клас совецкай краіны на смерць Леніна адказаў яшчэ большым згуртаваннем вакол комуністычнай партыі і паслаў у яе рады звыш 240 тысяч лепшых сваіх сыноў.

Ворагі пралічыліся, таму што партыя, рабочыя і працоўныя Совецкага Саюза, сусветны пралетарыят — вылучылі са сваіх радоў дастойнага праемніка Леніна, таго,

хто разам з Леніным будаваў партыю і мацаваў адзінства яе радоў,

хто ніколі не адступаў ад Леніна,

хто разам з Леніным кіраваў барацьбой і перамогамі рабочага класа ў Кастрычніку і ў грамадзянскай вайне,

хто разам з Леніным выпрацаваў план перáўтварэння нашай краіны і ў паследуючыя годы ажыццявіў гэты план.

Ворагі пралічыліся, таму што на чале партыі, краіны і рэволюцыі стаў вялікі прадаўжальнік справы Леніна таварыш Сталін. **(Бурныя апладысменты).**

## I.

Смерць вырвала з нашых радоў Леніна тады, калі партыя і краіна перажывалі вельмі складаную і цяжкую абстаноўку.

Як вы памятаеце, зусім незадоўга да гэтага ў краіне закончылася грамадзянская вайна.

Врангель быў разбіт у канцы 1920 года. Мір з Польшчай ратыфіцыраван у красавіку 1921 года. Так званая карэльская авантура ліквідавана ў пачатку 1922 года. Войскі Чырвонай Арміі вышвырнулі японскіх інтэрвентаў з совецкай зямлі і ўзялі Владзівасток у кастрычніку 1922 года.

Перамога ў грамадзянскай вайне над рускай белагвардзейшчынай, над імперыялістычнай інтэрвенцыяй далася не дарма. Гэта перамога патрабавала нечалавечых намаганняў ад усёй краіны, велізарнейшай напружанасці эканомікі, беззаветнага гераізма і афяр з боку пролетарыята. З вайны совецкая краіна выйшла абяссіленай.

«Толькі пасля скончэння вайны мы ўбачылі ўсю тую ступень разарэння і галечы, якія надоўга асуджаюць нас на простае толькі злячэнне ран», — гаварыў Ленін.

Прадукцыя буйнай прамысловасці ў 1920 годзе была амаль у сем разоў менш даваеннай. Выплаўка чыгуна, у параўнанні з даваенным часам, у 1921 годзе складала каля 3 проц., здабыча руды ўпала да 1,7 проц., медзі — 0. Большасць фабрык і транспарт разбураны, шахты затоплены.

Сялянская гаспадарка да катастрафічных размераў скараціла пасевы і збор культур.

Снабжэнне вёскі промтаварамі амаль спынілася, эканамічныя сувязі горада з вёскай надзвычай аслаблі.

Задача, якая стаяла тады перад партыяй, зводзілася да таго, каб аднавіць сялянскую гаспадарку, без чаго немысліма было ніякае аднаўленне прамысловасці, прывесці ў парадак і ўмацаваць рады пролетарыята, абуздаць дробнабуржуазную стыхію.

Перад партыяй вырысоўваўся адзіны шлях аднаўлення сельскай гаспадаркі — гэта шлях дапушчэння ў пэўных прадзелах свабоды абароту, свабоды для дробнага гаспадара.

Партыя на гэта пайшла, — замяніўшы продразвёрстку продналогам, прадаставіўшы права селяніну свабодна распараджацца лішкамі.

Вёска атрымала стымул для развіцця гаспадаркі.

Новая эканамічная палітыка, на шлях якой стала ў гэтыя годы наша партыя, неўзабаве паказала свае першыя станоўчыя рэзультаты і апраўдала сябе цалкам і поўнасцю.

Аднаўленне народнай гаспадаркі, якое пачалося з увядзеннем НЭП'а, ішло быстрымі тэмпамі, — аднаўлялася прамысловасць, аднаўлялася сельская гаспадарка.

Па меры аднаўлення прамысловасці ішоў працэс росту і кансалідацыі рабочага класа.

Серадняк, як цэнтральная фігура ў вёсцы, яшчэ больш умацаваўся. Побач з гэтым адбываўся рост капіталістычных элементаў у горадзе і асабліва ў вёсцы. У суадносінах класаў стварылася новае становішча. У парадак дня ўстала новае пытанне — хто хутчэй выкарыстае новае становішча, соцыялістычныя элементы або капіталістычныя, за кім пойдзе сялянства — за пролетарыятам, які будуе соцыялізм, або за капіталістамі.

Неабходна ўлічыць, што ў 1923 годзе ўдзельная вага прыватнага капітала ў гандлі складала больш 50 проц., а ў рознічным тавараабароце яна даходзіла да 80 проц.

Ленін у такіх словах фармуліраваў становішча, якое склалася ў краіне:

**«Хто пераможа — капіталіст або совецкая ўлада?..** Усё пытанне — хто каго апярэдзіць? Паспеюць капіталісты раней зарганізавацца, — і тады яны комуністаў прагоняць, і ўжо тут ніякіх размоваў быць не можа. Трэба глядзець на гэтыя рэчы цвяроза: хто каго?» **(Ленін,** том XXVII, стар. 41—42).

Вось як крута ставіў пытанне таварыш Ленін!

Партыя дапусціла некаторае ажыўленне капіталізма пры ўсямерным развіцці соцыялізма і цвёрда разлічвала на тое, каб у спаборніцтве, якое пачалося паміж капіталістычнымі элементамі і соцыялістычнымі, арганізаваць перавагу соцыялістычнай сістэмы над капіталістычнай і дабіцца ліквідацыі капіталістычных элементаў.

Увесь паследуючы вопыт соцыялістычнага будаўніцтва цалкам апраўдаў гэтую палітыку.

І як толькі ўдалося дабіцца першых сносных поспехаў у аднаўленні народнай гаспадаркі, — перад партыяй з усёй сілай устала пытанне аб перспектывах і характары далейшага развіцця.

У «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» пытанні аб лёсах і перспектывах соцыялізма ў Совецкім Саюзе, якія практычна ўсталі ў тыя годы перад партыяй і рабочым класам, фармуліраваны так:

«У якім напрамку трэба весці гаспадарчае будаўніцтва ў Совецкім Саюзе, у напрамку да соцыялізма, або ў якім-небудзь іншым напрамку? Ці павінны і ці можам мы пабудаваць соцыялістычную гаспадарку, або нам суджана ўгнаіць глебу для іншай, капіталістычнай гаспадаркі? Ці магчыма наогул пабудаваць соцыялістычную гаспадарку ў СССР, а калі магчыма, то ці магчыма яе пабудаваць пры запяжцы рэволюцыі ў капіталістычных краінах і стабілізацыі капіталізма? Ці магчыма пабудова соцыялістычнай гаспадаркі на шляхах новай эканамічнай палітыкі, якая, усямерна ўмацоўваючы і пашыраючы сілы соцыялізма ў краіне, разам з тым пакуль-што дае і некаторы рост капіталізма? Як трэба будаваць соцыялістычную народную гаспадарку, з якога канца трэба пачаць гэта будаўніцтва?».

Партыя на ўсе гэтыя пытанні адказала, усе гэтыя пытанні вырашыла і дабілася сусветна-гістарычных поспехаў на аснове выканання ленінска-сталінскага плана пабудовы соцыялізма ў нашай краіне, які ўключаў такія моманты:

1. Стварэнне магутнай соцыялістычнай індустрыі, на аснове электрыфікацыі, як базы для рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

2. Спачатку больш простыя формы — кааперыраванне сялянскіх гаспадарак пераважна ў галіне збыту, — а затым пераход да вышэйшых форм кааперыравання — да калектывізацыі на аснове аснашчэння сельскай гаспадаркі навейшай сельскагаспадарчай тэхнікай.

## II.

Ленін і Сталін прыступілі да намячэння плана перáўтварэння нашай краіны яшчэ ў годы самай жорсткай грамадзянскай вайны. Толькі яны — тытаны мыслі, геніяльныя правадыры — скрозь франты грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі, блакаду, разруху, голад і холад умелі не толькі бачыць заўтрашні дзень, але і падрыхтоўваць яго.

Адразу-ж пасля перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі Ленін неаднаразова ўказваў, што перамога соцыялізма магчыма толькі на аснове электрыфікацыі ўсёй краіны.

Яшчэ ў 1918 годзе Ленін патрабаваў «звяртання асаблівай увагі на электрыфікацыю прамысловасці і транспарта і прымянення электрычнасці да земляробства». (Том XXII, стар. 434).

У плане брашуры «Аб продналогу» Ленін піша:

«**Калі** электрыфікацыя праз 10—20 год, ні каплі не страшны індывідуалізм дробнага **земляроба** і вольны гандаль **яго** ў мясцовым абароце. **Калі** не электрыфікацыя, **ўсёроўна** немінучы зварот да капіталізма». **(Ленін,** том. XXVI, стар. 313).

Па прапанове Леніна ўрад стварыў дзяржаўную камісію па электрыфікацыі Расіі — ГОЭЛРО. Дзвесце вучоных, інжынераў і тэхнікаў прыступілі да складання плана электрыфікацыі. Заўсёды натхняемая Леніным і Сталіным, камісія выпрацавала план электрыфікацыі, і ён на справе з'явіўся першым адзіным народнагаспадарчым планам Совецкай рэспублікі.

«Комунізм ёсць Совецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны», — так у прадзельна сціслай і яснай форме сфармуліраваў Ленін генеральную задачу партыі.

Па мыслі Леніна і Сталіна гэты план разумеўся не як ізаляваная пабудаваныя асобныя электрастанцыі, а як перавод усёй народнай гаспадаркі краіны, у тым ліку і сельскай гаспадаркі, на базу новай, сучаснай тэхнікі. Іменна таму Ленін назваў гэты план «другой праграмай партыі».

Вакол плана ГОЭЛРО разгарнулася жорсткая барацьба, усе ворагі партыі і рабочага класа ашчацініліся супроць гэтага плана.

Унутры партыі супроць плана электрыфікацыі выступілі троцкія, рыкавы і іх падпявалы. Яны тармазілі, сабатавалі і зрывалі план электрыфікацыі.

Таварыш Сталін разам з Леніным змагаецца з усімі ворагамі плана ГОЭЛРО, граміць няве р'е ў сілы пролетарыята і капітулянцтва меншавіцка-трацкісцкіх элементаў.

Нельга без хвалявання чытаць пісьмо Сталіна Леніну (сакавік 1921 года) аб плане электрыфікацыі:



«Выдатная, добра састаўленая кніга. Майстэрскі набросак сапраўды **адзінага** і сапраўды **дзяржаўнага** гаспадарчага плана **без кавычак.** Адзіная ў наш час марксісцкая спроба падвядзення пад совецкую надбудову гаспадарча-адсталай Расіі сапраўды рэальнай і адзіна магчымай пры сучасных умовах тэхнічна вытворчай базы. Памятаеце мінулагодні «план» Троцкага (яго тэзісы) «гаспадарчага адраджэння» Расіі на аснове масавага прымянення да абломкаў даваеннай прамысловасці працы некваліфікаванай **сялянска**-рабочай масы (праца арміі). Якое ўбоства, якая адсталасць у параўнанні з планам **гоэлро!** Сярэдневяковы кустар, які вазамніў сябе ібсенаўскім героем, заклікаЬым «выратаваць» Расію сагай старыннай... А чаго варты дзесяткі «адзіных планаў», якія з'яўляюцца ўвесь час у нашым друку на ганьбу нам, — дзіцячы лепет прыгатавішак... Або яшчэ: абывацельскі «рэалізм» (на самой справе **маніла ўшчына)** Рыкава, усё яшчэ «крытыкуючага» **гоэлро** і па вушы загразшага ў руціне...»

Ленінска-Сталінскі план электрыфікацыі перамог. Смелы план ГОЭЛРО ў рэзультаце сталінскіх пяцігодак перакрыт.

План будаўніцтва электрастанцый і вытворчасці электраэнергіі ў многа раз перавыканан.

Па плану ГОЭЛРО меркавалася пабудаваць 30 новых раённых электрастанцый. Пабудавана іх значна больш.

У 1938 годзе выпрацавана энергіі $36^1/_2$ мільярдаў кіловат-гадзін.

У 1923 годзе наша краіна па вытворчасці электраэнергіі займала сярод другіх краін дзевятнаццатае месца. У 1937 г. яна займала трэцяе месца. **(Апладысменты).**

## III.

Вядома, што асновай і хрыбтом народнай гаспадаркі з'яўляецца цяжкая прамысловасць.

Аб ролі індустрыялізацыі і цяжкай прамысловасці Ленін пісаў так:

«Выратаваннем для Расіі з'яўляецца не толькі добры ўраджай у сялянскай гаспадарцы — гэтага яшчэ мала, — і не толькі добры стан лёгкай прамысловасці, пастаўляючай сялянству прадметы спажывання, — гэтага таксама яшчэ мала, — нам неабходна таксама **цяжкая** індустрыя. А для таго, каб прывесці яе ў добры стан, спатрэбіцца многа год работы.

Цяжкая індустрыя мае патрэбу ў дзяржаўных субсідыях. Калі мы іх не знойдзем, то мы, як цывілізаваная дзяржава — я ўжо не гавару, як соцыялістычная, — загінулі». **(Ленін,** том XXVII, стар. 349).

Вось як крута ставіў пытанне таварыш Ленін!

Кожны грамадскі лад узнікае толькі пры фінансавым падтрыманні пэўнага класа. Для стварэння, умацавання і расшырэння нашага ладу — соцыялістычнага — патрэбна было таксама фінансавае падтрыманне з боку рабочага класа і яго саюзніка — сялянства.

Для стварэння цяжкай прамысловасці патрэбны былі мільярды. Шаснаццаць год назад краіна магла выдзеліць на цяжкую прамысловасць усяго толькі 20 мільёнаў залатых рублёў, і тады Ленін разглядаў гэту падзею як першую сур'ёзную перамогу, аб якой ён лічыў неабходным далажыць на IV кангрэсе Комінтэрна.

Ідэолагі рэстаўрацыі капіталізма бачылі адзін шлях для аднаўлення і рэканструкцыі прамысловасці, — гэта прыцягненне замежнага капітала. Замежныя банкіры лічылі, што Расія ўласнымі сіламі не абыйдзецца і на паклон да іх, банкіраў, усёроўна прыдзе. Ісці на паклон да замежных капіталістаў і схіліць перад імі галаву прапанавалі трацкісты, бухарынцы, рыкаўцы, зіноўеўцы.

Гэты шлях азначаў закабаленне краіны, ператварэнне яе ў аграрны дадатак да прамысловасці Еўропы, страту самастойнасці краіны Советаў, ператварэнне яе ў калонію імперыялізма.

Партыя пайшла Ленінска-Сталінскім шляхам індустрыялізацыі і дабілася таго, што замест 20 мільёнаў рублёў, укладзеных у прамысловасць шаснаццаць год назад, уклала ў соцыялістычную гаспадарку за годы першай пяцігодкі, — якая, як вядома, была выканана ў 4 годы і 3 месяцы, — 50 з палавінай мільярдаў рублёў, за годы другой пяцігодкі — звыш 137 мільярдаў рублёў і ў адзін толькі 1938 год — 35 мільярдаў рублёў. Львіная доля гэтых укладанняў была накіравана на цяжкую індустрыю.

Я ўжо гаварыў аб узроўні прамысловасці ў дні, калі партыя пераходзіла да НЭП'а. Але вось, што прадстаўляла сабой цяжкая прамысловасць у 1923 годзе. У гэты год было выпрацавана 300 тысяч тон чыгуна, 600 тысяч тон сталі, 500 тысяч тон пракату. У 1923 годзе ў краіне не выпускалася ні трактароў, ні аўтамабіляў. Гавораць, што ў 1924 годзе ўдалося сабраць часткова з старых, часткова з новых замежных, не нашых часцей, 10 штук аўтамабіляў і 10 штук трактароў.

У 1938 годзе наша прамысловасць выпрацавала каля 15 мільёнаў тон чыгуна, замест 300 тысяч, 18 мільёнаў тон сталі, замест 600 тысяч, каля 13 з палавінай мільёнаў тон пракату, замест 500 тысяч, выпусціла каля 50 тысяч трактароў, больш 200 тысяч аўтамабіляў, 23 тысячы камбайнаў.

Мы дагналі па многіх відах вытворчасці перадавыя ў тэхнічных адносінах капіталістычныя краіны. За гэтыя годы мы нанава пабудавалі цэлыя новыя галіны прамысловасці, якіх не было раней.

Як ні грандыёзны, як ні смелы быў план ГОЭЛРО для тых дзён, калі ён выпрацоўваўся, але і ён не змог улічыць усіх магчымасцей, якія тоіць у сабе совецкая сістэма. Па плану ГОЭЛРО меркавалася, што за 10—15 год вытворчасць прамысловай прадукцыі перавысіць даваенны ўзровень у два разы. У 1937 годзе, г. зн. праз 16 год пасля прыняцця плана ГОЭЛРО, узровень прамысловасці ў параўнанні з даваенным павялічыўся не ў два разы, а больш чым у сем разоў. Прадукцыя буйнай прамысловасці ў 1938 годзе вырасла ў параўнанні з 1923 годам у дваццаць два — дваццаць тры разы.

Днямі апублікаваны даныя аб росце прадукцыі прамысловасці СССР за 1938 год. У той час як прамысловая вытворчасць у краінах капіталізма ў 1938 годзе ў параўнанні з 1937 годам знізілася на 13,5 проц., прамысловая вытворчасць СССР вырасла на 12 проц. Гэтыя лічбы сведчаць аб упэўненым і магутным уздыме соцыялістычнай індустрыі, яшчэ і яшчэ раз сведчаць аб перавазе соцыялістычнай сістэмы над капіталістычнай.

Такі шлях, які прарабіла совецкая прамысловасць за гэтыя годы пад кіраўніцтвам нашай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

## IV.

Велізарную перамогу атрымала наша партыя ў сельскай гаспадарцы.

Што прадстаўляла сабой сялянства?

Гэта быў клас дробных вытворцаў, раскіданы па твару зямлі, эксплаатуемы памешчыкамі, кулакамі, спекулянтамі, растаўшчыкамі. Так селянін, раб прыватнай уласнасці, жыў сотні год.

Колькі выдатных і яркіх старонак ёсць у сусветнай літаратуры, паказваючых рабскае, залежнае становішча сялян ад свайго кавалачка зямлі, калі ў пагоні за тым, каб атрымаць гэты кавалачак, людзі нярэдка трацілі ўсякае чалавечае падабенства.

Варта толькі ўспомніць аб так званых раздзелах, апісаных у рускай літаратуры, калі нярэдка даходзіла да таго, што хату пілавалі, разбіралі па бервяну — «не даставайся ні мне, ні табе», і калі нярэдка раздзел канчаўся панажоўшчынай, забойствам: сын ударам тапара забіваў бацьку, браты ішлі адзін на аднаго з коллямі, і ўсё гэта тварылася ў імя прыватнай уласнасці, якой нярэдка і цана-та была капейка.

У рамане «Зямля» французскі пісьменнік Золя апісвае жыццё двух сясцёр — Лізы і Франсуазы. Жывуць яны мірна, ціха, любяць і паважаюць адна адну. Але вось прыступлена да раздзелу ўчастка зямлі, і сёстры ператвараюцца ў лютых звераў. Справа канчаецца тым, што адна з сясцёр каснй зарэзала другую, пяжарную, — зарэзала, каб знішчыць не толькі яе — сястру, — але і будучае дзіця — наследніка, каб самой заўладаць кавалачкам зямлі. І такое тварылася і творыцца паўсямесна там, дзе лапа прыватнай уласнасці трымае людзей за горла.

Які-ж пераварот павінна была зрабіць совецкая ўлада ў сазнанні сялянства, каб апракінуць, каб не аставіць камення на камені вось ад такіх адносін людзей адзін да аднаго, ад адносін, якія характарызуюцца словамі: — «чалавек чалавеку воўк».

Марксізм-ленінізм вучыць, што пры капіталізме сельская гаспадарка развіваецца па тых-жа законах, што і прамысловасць, а таму **немінучасць** змены капіталістычных форм соцыялістычнымі ў сельскай гаспадарцы дыктуецца тымі-ж законамі, што і ў прамысловасці.

У процілегласць марксісцка-ленінскай тэорыі буржуазныя і дробнабуржуазныя «тэарэтыкі» сцвярджалі, што дробнае земляробства не толькі не пасуе перад буйным, але мае перавагі перад апошнім. Дзякуючы гэтым перавагам, якія нібы заключаюцца ў тым, што дробны селянін церплівы, вынослівы, што ён гатоў ісці на любыя лішэнні, абы толькі адстаяць свой кавалачак зямлі, дробная гаспадарка не толькі не выцясняецца буйнай, а наадварот, займае новыя пазіцыі, у сілу чаго ў земляробстве адсутнічае працэс канцэнтрацыі і цэнтралізацыі капітала, адсутнічае працэс утварэння сельскагаспадарчага пролетарыята, адсутнічае нарастанне класавых супярэчнасцей і класавай барацьбы.

Такава тэорыя «ўстойлівасці» дробнага земляробства, з якой Ленін і Сталін вялі барацьбу многа год, якая мела шырокае распаўсюджанне і, напрыклад, знайшла адлюстраванне ў праграмах амаль усіх партый II Інтэрнацыянала.

Тэорыя «ўстойлівасці» прадыктавана інтарэсамі буржуазіі. Апалагеты капіталізма ў імкненні прадухіліць гібель прыватнай уласнасці хапаліся за ілюзію, за саломінку. Яны імкнуліся даказаць, што соцыялізм немінуча астановіцца ля парога дробнай сельскай гаспадаркі.

Ідэйка «ўстойлівасці» дробнай сельскагаспадарчай вытворчасці перад усёперамагаючым соцыялізмам была перанесена і на совецкую глебу і высоўвалася ў якасці аргумента супроць буйной соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

У якасці набарнікаў тэорыі «ўстойлівасці» дробнай індывідуальнай сельскай гаспадаркі і ворагаў калектывізацыі выступалі: кулацкая контррэволюцыйная кліка кандрацьеўцаў-чаянаўцаў; меншавіцкая контррэволюцыйная кліка; контррэволюцыйная банда правых і трацкістаў.

Усе яны разгромлены партыяй пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. **(Апладысменты).**

Што сабой прадстаўляла сельская гаспадарка ў дні, калі ўшоў ад нас таварыш Ленін? Гэта быў акіян дробнатаварных раздробленых сялянскіх гаспадарак. Аб ролі калгасаў, аб іх удзельнай вазе ў сельскай гаспадарцы тады і гутаркі не было. Кулацтва адыгрывала прыкметную ролю ў сельскай гаспадарцы. Дробнатаварная сялянская гаспадарка сама з'яўлялася пажыўным асяроддзем для капіталістычных элементаў.

І тут зноў карысна ўспомніць, што гаварыў таварыш Ленін. А гаварыў ён наступнае:

«Пакуль мы жывем у дробна-сялянскай краіне, для капіталізма ў Расіі ёсць больш моцная эканамічная база, чым для комунізма». **(Ленін,** том XXVI, стар. 46).

У другім месцы Ленін пісаў:

«10—20 год правільных суадносін з сялянствам і забяспечана перамога ў сусветным маштабе (нават пры запяжцы пролетарскіх рэволюцый, якія растуць), інакш 20—40 год мучэнняў белагвардзейскага тэрора». **(Ленін,** том XXVI, стар. 313).

Вось як крута ставіў пытанне таварыш Ленін! Або мы пабудуем буйную машынізаваную соцыялістычную калектыўную сельскую гаспадарку — або загінем.

Гістарычная немінучасць калектывізацыі дыктавалася і тым, што дробная індывідуальная сялянская гаспадарка, прадаўжаўшая і далей драбіцца і драбіцца, з'яўлялася малатаварнай, паўспажывецкай і не толькі не ажыццяўляла ў сваёй масе расшыранага ўзнаўлення, але не заўсёды ажыццяўляла нават простае ўзнаўленне.

У 1927 годзе сялянская гаспадарка давала таварнага хлеба ўсяго толькі 11,2 проц. усёй сумы сваёй прадукцыі. Рост вытворчасці хлеба знаходзіўся ў рэзкай супярэчнасці з ростам патрэбнасцей. Пад прамую пагрозу было пастаўлена снабжэнне горада, Чырвонай Арміі і т. д.

Таварыш Сталін паставіў пытанне з усёй рэзкасцю. Ен гаварыў:

«Ці можна на працягу больш або менш доўгага перыяда часу базіраваць Совецкую ўладу і соцыялістычнае будаўніцтва на двух **розных** асновах — на аснове самай буйнай і аб'яднанай соцыялістычнай прамысловасці і на аснове самай раздробленай і адсталай дробна-таварнай сялянскай гаспадаркі? Не, нельга. Гэта калі-небудзь павінна скончыцца поўным развалам усёй народнай гаспадаркі». **(Сталін: «Да пытанняў аграрнай палітыкі ў СССР»).**

Вось як крута паставіў пытанне таварыш Сталін!

Непасрэдныя інтарэсы самага селяніна таксама штурхалі яго на шлях узбуйненай гаспадаркі. Дробна-таварная, паўспажывецкая, дробная гаспадарка не забяспечвала растучых запросаў прамысловасці з аднаго боку, — з другога — асуджала самага селяніна на поўжабрацкае існаванне. Патрэбен быў выхад са становішча. Выхад быў такі — або стаць на соцыялістычны шлях узбуйнення гаспадаркі, павышэння прадукцыйнасці і таварнасці праз калгасы, або стаць на шлях капіталістычнага ўзбуйнення.

Апекуны і абаронцы кулацтва — трацкісты і бухарынцы клікалі сялянства пайсці па другому шляху, прапаноўвалі, як выхад са становішча, разгортванне кулацкай гаспадаркі. Але гэты шлях азначаў пераход зямлі ад серадпякоў да кулакоў, разарэнне асноўных мас сялянства, асуджэнне працоўных мас на голад і жабрацтва, — гэты шлях азначаў рэстаўрацыю капіталізма.

Сялянства, кіруемае рабочым класам і партыяй, адвергла гэта яўнае капітулянцтва перад кулацтвам і міжнароднай буржуазіяй.

Селянін матэрыяліст. Ен зразумеў, што партыя, прапаноўваючы яму ўступіць на шлях калгаснай соцыялістычнай працы, дае яму сапраўдную магчымасць забяспечыць заможнае і культурнае жыццё. Такім чынам, кроўная эканамічная неабходнасць дыктавала селяніну пераход да калгасаў.

Адзін быў выхад — суцэльная калектывізацыя і на гэтай базе ліквідацыя кулацтва як класа. Па гэтаму адзіна правільнаму шляху і павёў краіну таварыш Сталін.

Пераход ад дробнай сялянскай гаспадаркі да буйнай, калектыўнай — аблегчыўся тым, што ў нас у свой час была ажыццёўлена нацыяналізацыя зямлі, вызваляючая селяніна ад яго рабскай прыверджанасці да свайго кавалачка зямлі.

А што мы зараз маем у сельскай гаспадарцы? Мы рашылі сусветна-гістарычную задачу, цяпер няма акіяна дробных раздробленых сялянскіх гаспадарак. Рэстаўратарскія тэорыйкі «ўстойлівасці» дробнай індывідуальнай сялянскай гаспадаркі развеяны ўпрах. Цяпер мы маем калгасы і соўгасы, — буйныя соцыялістычныя прадпрыемствы на аснове навейшай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Краіна пераведзена з рэльсаў сярэдневяковя, убогай тэхнікі, нізкай культуры — на рэльсы сучаснай індустрыі і буйнай механізаванай сельскай гаспадаркі. 250 тысяч калгасаў, 6 344 машынатрактарных станцый, $474^1/_2$ тысячы трактароў у іх, 150 тысяч камбайнаў, звыш 170 тысяч аўтамабіляў, сотні тысяч трактарных плугоў, трактарных сеялак, культыватараў, складаных малатарань і г. д. — вось база соцыялістычнага земляробства. Гэтай складанай і разнастайнай тэхнікай кіруюць абучаныя і выхаваныя совецкай уладай кадры.

Сялянства ўступіла на шлях калгаснага заможнага жыцця, на вопыце пераканалася ў карысці калгасаў, і цяпер сялянства з гэтага шляху не зверне ніякая сіла.

45 год назад у кнізе «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў?» Ленін упершыню ў гісторыі высунуў ідэю рэволюцыйнага саюза рабочых і сялян.

Гэта ідэя Леніна пранізвае ўсю гісторыю барацьбы партыі большэвікоў на ўсіх яе этапах.

Таварыш Ленін завяшчаў нам умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян.

Тое, што адбылося ў нашай краіне ў паследуючыя — пасля смерці таварыша Леніна — годы, а іменна, ажыццяўленне лозунга ліквідацыі кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі — гэта і азначала самае найлепшае вырашэнне пытання аб непарушнасці саюза рабочых і сялян.

Ажыццяўленне гэтага лозунга азначала такі найглыбейшы рэволюцыйны пераварот, які роўназначны «па сваіх выніках рэволюцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»).

Вырашана самая цяжкая і самая складаная задача пасля заваявання ўлады рабочым класам. Совецкае сялянства канчаткова і беспаваротна стала на шлях калгаснай працы і стала актыўнай сілай соцыялістычнага будаўніцтва.

Такі шлях, які прарабіла наша совецкая гаспадарка, пад кіраўніцтвам нашай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

(ПРАЦЯГ НА 3-Й СТАР).

# СПРАВА ЛЕНІНА ПЕРАМАГЛА!

## *Працяг даклада тав. А. С. ШЧЭРБАКОВА, 21 студзеня 1939 года, на жалобным пасяджэнні ў Вялікім тэатры, прысвечаным XV гадавіне з дня смерці В. І. Леніна*

### V.

І яшчэ аб адным пытанні трэба сказаць. Ленін гаварыў:

«Прадукцыйнасць працы, гэта, у апошнім ліку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадскага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасць працы, нябачаную пры прыгонніцтве. Капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што сацыялізм стварае новую, значна больш высокую прадукцыйнасць працы». **(Ленін,** том XXIV, стар. 342)

Мы з'яўляемся зараз удзельнікамі новага этапа барацьбы за высокую сацыялістычную прадукцыйнасць працы, які праявіўся ў стаханаўскім руху. Ленін угледзеў у першым камуністычным суботніку на Маскоўска-Казанскай чыгунцы ў 1919 годзе, ва ўмовах разрухі і голаду,—падзею сусветна-гістарычнага значэння, праяўленне такіх адносін да працы, якія зробяць сацыялізм непераможным.

Цяпер у іншых умовах, на аснове навейшай, самай перадавой тэхнікі, новай культуры, у краіне бурна разгортваецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі рух стаханаўцаў, гістарычны сэнс якога ўскрыў таварыш Сталін,—як рух, які

ламае старыя погляды на тэхніку,

знамянуе пачатак небывалага ўздыму рабочага класа,

наглядна і практычна сцвярджае, што прадукцыйнасць працы пры сацыялізме вышэй чым пры капіталізме, і

падрыхтоўвае ўмовы для пераходу ад сацыялізма да комунізма.

У нас ёсць яшчэ людзі, якія не хочуць па-чэснаму працаваць і тым самым падрываюць інтарэсы вытворчасці, інтарэсы калектыва.

Гэта лодыры, рвачы, прагульшчыкі, летуны, раскрадальнікі сацыялістычнай уласнасці. Гэта яны падрываюць працоўную дысцыпліну, зніжаюць прадукцыйнасць працы, наносяць шкоду дзяржаве.

Самі рабочыя і служачыя патрабавалі ад урада правесці рэзкую грань паміж чэснымі работнікамі і дэзарганізатарамі вытворчасці. У рабочых і служачых знойдзецца дастаткова сіл, каб абуздаць усіх тых, хто працаваць не хоча, хто хоча пажыць за кошт чэсных работнікаў, хто наровіць залезці ў кішэню дзяржавы.

Што датычыць прадукцыйнасці працы, то яна расце ў нас не малымі тэмпамі, за годы другой пяцігодкі прадукцыйнасць працы ў прамысловасці ўзрасла на 83 проц. Няма сумнення, што на аснове стаханаўскага руху — гэтай вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва—мы ў краіне сацыялізма даб'емся такога ўзроўню прадукцыйнасці працы, які недаступны ва ўмовах капіталізма. **(Апладысменты).**

### VI.

Цяпер зусім іншай стала эканоміка нашай краіны, іншымі сталі ў нашай краіне грамадскія адносіны, змянілася класавая структура. Сацыялістычная сістэма гаспадаркі, сацыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці складае эканамічную аснову Совецкага Саюза. Праца з рабскай і паднявольнай, якой яна з'яўляецца пры капіталізме, стала справай чэсці і славы, акружана павагай і пачотам. Ліквідавана беспрацоўе, сяляне жывуць заможным калгасным жыццём.

У нашай краіне назаўсёды знішчаны эксплаататарскія класы памешчыкаў, капіталістаў і кулацтва.

Наша грамадства складаецца выключна са свабодных тружанікаў горада і вёскі — рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

Таварыш Сталін у 1924 годзе ў Чырвонай кнізе завода «Дынамо» запісаў такія выдатнейшыя словы:

«Жадаю рабочым «Дынамо», як і рабочым усёй Расіі, таго, каб прамысловасць пайшла ўгару, і каб колькасць пролетарыяў у Расіі ўзнялася ў бліжэйшы перыяд да 20—30 мільёнаў, каб калектыўная гаспадарка ў вёсцы расквітнела і падначаліла свайму ўплыву прыватную гаспадарку, каб высокая індустрыя і калектыўная гаспадарка ў вёсцы спаялі канчаткова пролетарыяў фабрык і тружанікаў зямлі ў адну сацыялістычную армію...»

Збылося прадбачанне таварыша Сталіна. **(Апладысменты).**

У нашай краіне створана новае чалавечае грамадства, дзе няма эксплаататарскіх класаў.

Вялікі дасягненні і ў галіне ўзаемаадносін паміж народамі СССР.

Яшчэ нядаўна ў нас былі народы, якія лічыліся адсталымі ў эканамічных і культурных адносінах. Сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі з'явілася магутным сродкам для ліквідацыі адсталасці нацыянальных рэспублік, абласцей і раёнаў.

Старая Расія была турмой народаў. СССР — адзіная сям'я ўсіх народаў, насяляючых нашу краіну, аб'яднаных непарушнай брацкай дружбай у барацьбе за сацыялізм.

СССР стаў краінай самай перадавой культуры. Будаўніцтва новых многіх дзесяткаў тысяч школ, соцень навучальных устаноў, ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага навучання, будаўніцтва тэатраў і клубаў, нябачаныя тыражы кніг і газет, права кожнага грамадзяніна на асвету, надзвычай хуткае вылучэнне кадраў і рост талентаў — вось гэта і ёсць сапраўдная культурная рэвалюцыя, аб якой марыў Ленін і якая цяпер ажыццяўляецца надзвычай быстра.

Ітогі сусветна-гістарычных перамог запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі. На аснове гэтых перамог, якія атрыманы працоўнымі на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва, у нашай краіне стварылася нябачанае раней і не могучае мець месца ні ў адной з краін з капіталістычным ладам **«маральнае і палітычнае адзінства народа,** маральнае і палітычнае адзінства сацыялістычнага грамадства». **(Молатаў).**

Адзінства нашага народа, рост яго сацыялістычнага сазнання, нябачаная згуртаванасць народных мас вакол нашай партыі найбольш ярка праявіліся ў дні выбараў Вярхоўнага Совета Саюза, а затым у дні выбараў Вярхоўных Советаў рэспублік.

Совецкі народ дэманструе сваё маральнае і палітычнае адзінства, разуменне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, сваю вернасць комунізму — кожны дзень, кожную гадзіну, — калі ён, совецкі народ, падтрымлівае і ажыццяўляе ўсе мерапрыемствы партыі і ўрада.

Перамога сацыялізма дала магчымасць перайсці ў нашай краіне да шырока разгорнутай сацыялістычнай дэмакратыі.

Некаторыя абмежаванні ў палітычных правах для часткі насельніцтва, якія практыкаваліся раней і якія вынікалі з уліку эканамічных і класавых адносін, існаваўшых тады ў краіне, Сталінскай Канстытуцыяй адменены, і да дзяржаўнага кіравання прыцягнуты новыя масы працоўных.

СССР з'яўляецца краінай сапраўднай усенароднай дэмакратыі.

Гэты росквіт сацыялістычнага дэмакратызма азначае ў той-жа час умацаванне Совецкай дзяржавы, далейшае ўзрастанне ролі дзяржавы.

Трэба сказаць, што па пытанню аб ролі сацыялістычнай дзяржавы не мала наблытана.

Антымарксісты, «тэарэтыкі», не разумеючыя, што марксізм не догма, а кіраўніцтва к дзеянню, не мала спісалі чарніл, даказваючы, што совецкая дзяржава — адміраючая дзяржава і што працэс адмірання совецкай дзяржавы пачаўся з самага першага моманту пролетарскай рэвалюцыі.

На справе абстаіць інакш.

Сацыялістычная рэвалюцыя перамагла ў адной краіне. Сацыялістычная дзяржава знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні.

Таварыш Ленін гаварыў, што перамога сацыялізма ў нашай краіне немінуча павінна выклікаць «прамое імкненне буржуазіі іншых краін да разгрому пераможнага пролетарыята сацыялістычнай дзяржавы». **(Ленін,** том XIX, стар. 325).

Капіталістычнае акружэнне толькі і чакае выпадку напасці на нашу дзяржаву.

Ці можна ў гэтых умовах гаварыць аб якім-небудзь адміранні дзяржавы?

Больш таго, ва ўмовах капіталістычнага акружэння асобае значэнне набывае адна з функцый дзяржаўнай улады — ахова жыцця грамадзян, маемасці і тэрыторыі краіны сацыялізма ад гэтага акружэння.

Каб абезапасіць сацыялізм ад проіскаў ворагаў, каб напад ворагаў на нашу краіну ператварыць у разгром і іх уласную гібель, патрэбна магутная, кваліфікаваная кадравая армія, патрэбны ўсе роды войск, добра абучаных, авалодаўшых складанай ваеннай тэхнікай.

У праграме нашай партыі, якая прынята ў 1919 годзе, г. зн. амаль дваццаць год назад, гаворыцца аб ператварэнні Чырвонай Арміі «ва ўсенародную сацыялістычную міліцыю».

Такая пастаноўка пытання — аб замене пастаяннай арміі ўсенароднай міліцыяй для таго часу была тэарэтычна правільнай. Але з тых дзён у будаўніцтве ўсіх армій свету адбыліся такія змены, якія не ўлічваць ніяк нельга.

У абстаноўцы шалёнага росту ўзбраення капіталістычных краін, быстрага прагрэса ваеннай тэхнікі, калі выключнае значэнне атрымалі такога роду зброі, як авіяцыя, хімія, танкі, стала быць, у абстаноўцы, калі ваенная падрыхтоўка байцоў і камандзіраў патрабуе значнага часу,—патрэбна пастаянная кадравая армія.

У гэтых умовах на міліцыйнай сістэме сучасную армію не пабудуеш. Стала быць, і абарону не пабудуеш.

Улічваючы гэтыя ўмовы, наша партыя і наш урад пабудавалі магутныя Чырвоную Армію і Чырвоны Флот, абаронную прамысловасць, адзелі ў сталь і бетон граніцы краіны пераможнага сацыялізма.

«З краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны Совецкі Саюз ператварыўся ў краіну магутную ў сэнсе абароназдольнасці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасцей, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя сродкі абароны і снабдзіць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку». **(Сталін).**

Партыя і ўрад трымаюць наш народ у пастаяннай мабілізацыйнай гатоўнасці, ні адзін вораг не застане нас знянацку.

На што здольна, да якіх геройскіх спраў гатова наша любімая ўсім народам Чырвоная Армія, — гэтаму ўвесь свет быў сведкай некалькі месяцаў таму назад. Ва ўсіх у памяці дні баёў ля возера Хасан, калі японская ваеншчына прабавала справацыраваць вайну супроць нас.

Увесь свет лішні раз пераканаўся ў тым, што словы большэвікоў не разыходзяцца са справай. Раз правадыр народаў таварыш Сталін сказаў, што «Ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддадзім нікому», — так таму і быць.

Адчулі сілу совецкай зброі японскія самураі.

Наша авіяцыя і артылерыя ў абломкі ператваралі японскія гарматы, у пыл спіралі іх бліндажы.

Нашы танкі давілі японскія акопы з усім, што там знаходзілася.

Нашы кулямёты смяротным агнём палівалі японскіх захватчыкаў.

Наша пяхота давяршыла справу, пачатую авіяцыяй, артылерыяй і танкамі

На совецкай зямлі, на Заазёрнай, па ранейшаму развяваецца чырвоны сцяг Советаў.

Партыя, урад і совецкі народ не шкадуюць ніякіх сіл і сродкаў для ўмацавання Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота.

Такавы дасягненні нашай партыі і ўсіх працоўных нашай краіны за годы, якія прайшлі пасля смерці Леніна.

Такавы шлях, які прайшла наша краіна за гэтыя годы пад кіраўніцтвам нашай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

### VII.

Нашы сусветна-гістарычныя перамогі заваяваны намаганнямі працоўных нашай краіны, пры падтрыманні пролетарыята іншых краін. «Без такога падтрымання нас даўно расклявалі-б». **(Сталін).**

Сусветны рабочы клас падтрымлівае краіну сацыялізма, таму што ён бачыць і ведае, што справа, за якую змагаюцца працоўныя СССР, ясць вызваленне і рабочым іншых краін.

Вось чаму рабочыя ўсіх краін так уважліва сочаць за нашай работай, за нашай барацьбой.

Працоўныя і прыгнечаныя капіталістычных краін бачаць, як у Совецкім Саюзе Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя з глыбокіх нізоў узняла мільёны людзей, адрадзіла іх да жыцця.

Яны бачаць, як совецкая ўлада, ліквідуючы беднасць і галечу, паклала моцныя асновы сацыялістычнага багацця, забяспечвае працоўным права на працу, на воды, на культуру.

Яны бачаць, як усе творчыя сілы ўцягнуты ў сазідальную работу.

З другога боку, яны — прыгнечаныя і эксплаатуемыя — бачаць, як фашызм штурхае чалавецтва назад да дзікасці, топча культуру, глуміцца над дастоінствам працоўных, прапаведуе звярыны шавінізм і чалавеканенавісніцтва, прабуе ператварыць у сваіх рабоў народы Іспаніі і Кітая.

Працоўныя і прыгнечаныя ўсіх краін ведаюць, што ў іх барацьбе за незалежнасць супроць фашызма, у іх барацьбе супроць капіталістычнага рабства, — яны маюць надзейную апору ў асобе Совецкага Саюза — краіны пераможнага сацыялізма.

Працоўныя СССР, свята захоўваючы ў сэрцы сваім завет таварыша Леніна аб вернасці прынцыпам Комуністычнага Інтэрнацыянала, не мала зрабілі для ўмацавання і расшырэння брацкіх сувязей з міжнародным пролетарыятам і высока нясуць званне ўдарнай брыгады сусветнага пролетарыята.

Вось чаму погляды працоўных усіх краін накіраваны да нас.

Вось чаму мільёны эксплаатуемых і прыгнечаных людзей капіталістычнага свету, назіраючы за нашымі перамогамі, загараюцца рашымасцю змагацца да канца за зваржэнне капіталізма, за знішчэнне фашызма. **(Апладысменты).**

### VIII.

Найвялікшыя перамогі совецкага народа атрыманы таму, што на чале рабочых і сялян стаяла і стаіць Комуністычная партыя.

«Ленін першы ў гісторыі марксізма распрацаваў **вучэнне аб партыі,** як кіруючай **арганізацыі** пролетарыята, як асноўнай **зброі** ў руках пролетарыята, без якой немагчыма перамагчы ў барацьбе за пролетарскую дыктатуру». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 50).

Ленін і Сталін вучылі, што нельга і думаць аб зваржэнні імперыялізма, аб заваяванні дыктатуры рабочага класа, аб перамозе сацыялізма—без стварэння партыі новага тыпу, без партыі рэвалюцыйнай і смелай, без партыі, загартаванай і гібкай, дастаткова вопытнай, каб разбірацца ў самых складаных умовах класавай барацьбы.

Ленін і Сталін распрацавалі тэарэтычныя і арганізацыйныя асновы партыі новага тыпу і на гэтых асновах пабудавалі нашу партыю.

Партыя новага тыпу — ёсць перадавы атрад рабочага класа, цесна звязаны ўсімі каранямі са сваім класам, які карыстаецца поўным давер'ем працоўных.

Такая партыя сама ёсць прыклад дысцыпліны і арганізаванасці, яна ўзброена самай перадавой тэорыяй, і ў сілу гэтых умоў, з'яўляючыся вышэйшай формай класавага аб'яднання пролетарыята, — кіруе ўсімі іншымі арганізацыямі пролетарыята.

Партыя можа паспяхова ажыццяўляць свае задачы пры абавязковай умове: калі ў яе радах царыць адзінства волі, адзінства дзеянняў і жалезная дысцыпліна.

Толькі такая партыя ў стане ўнесці ў масы дух дысцыпліны і арганізаванасці, навучыць масы змагацца з усімі і ўсякімі ворагамі, арганізаваць масы на барацьбу за перамогу сацыялізма.

Невыпадкова, што барацьба за адзіную і адзінственную партыю пролетарыята займае важнейшае месца ў гісторыі рэвалюцыі.

Не выпадкова ворагі першы свой удар накіроўвалі супроць партыйнага рэжыма, бо зрыў партыйнага адзінства азначаў-бы паражэнне рэвалюцыі.

Ленін і Сталін стварылі, выпеставалі і выхавалі такую партыю ў непрымірымай і прынцыповай барацьбе з усімі ворагамі як унутры рабочага руху, так і з ворагамі, пранікаўшымі ў саму партыю.

Як пры Леніне, так і асабліва пасля смерці Владзіміра Ільіча—усякія троцкія і бухарыны, рыкавы і каменевы — прабавалі ўдарыць па партыі, разлажыць і разваліць партыю, сцягнуць яе з Ленінскага шляху.

Судовыя працэсы над заклятымі ворагамі народа ўскрылі, што ўжо з першых дзён Вялікай Сацыялістычнай Рэвалюцыі праватрацкісцкія бандыты састаялі ў загаворы супроць Леніна, супроць партыі і народа;

што ўсе іх паследуючыя зладзеянні супроць партыі і народа на працягу дваццаці год праводзіліся па заданнях буржуазных разведак.

Выяснілася, што па заданню сваіх гаспадароў, трацкісцка-бухарынскія ізвергі ставілі сваёй мэтай разбурэнне партыі і Совецкай дзяржавы, падрыхтоўку паражэння Чырвонай Арміі ў будучай вайне, расчляненне Совецкай краіны і аднаўленне капіталізма ў СССР.

Але, як аб гэтым сказана ў «Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)» — «Гэтыя нікчэмныя лакеі фашыстаў забылі, што варта Совецкаму народу варухнуць пальцам, каб ад іх не асталося і следу».

Совецкі народ варухнуў пальцам і лакеі фашыстаў, белагвардзейскія казюркі — былі знішчаны.

Мы не можам зараз сказаць, што ворагі выяўлены і знішчаны ўсе да аднаго. Яны яшчэ ёсць. Адзінокія ў нашай краіне, прэзіраемыя народам, яны маюць некаторую сілу, з'яўляючыся агентурай капіталістычнага акружэння. Таварыш Сталін неаднаразова папярэджваў нас аб тым, што:

«Ці не ясна, што пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас шкоднікі, шпіёны, дыверсанты і забойцы, засылаемыя ў нашы тылы агентамі замежных дзяржаў?»

Таму барацьба з ворагамі народа будзе прадаўжацца з неаслабнай сілай.

Таварыш Сталін штодзенна вучыць комуністаў і беспартыйных пільнасці, вучыць таму, як трэба выяўляць і выкрываць подлых двурушнікаў, прабраўшыхся да нас па заданню замежных разведак.

Тая акалічнасць, што совецкія людзі пачалі ўсур'ёз асвайваць спосабы барацьбы з замежнымі разведкамі і іх наймітамі, што меры, прымаемыя нашай партыяй і ўрадам для ўмацавання совецкай разведкі, такія, што совецкая разведка несумненна будзе лепшай у свеце, — усё гэта дае поўную ўпэўненасць у тым, што подлым ворагам народа не будзе жыцця на совецкай зямлі і што ўсе ворагі і далей будуць знішчацца да апошняга.

Наймітам імперыялістычнай буржуазіі, здраднікам, шпіёнам, забойцам і дыверсантам нанесен сакрушальны ўдар.

Але нагадзіць і напакасціць яны паспелі не мала.

Палітычная бескляпотнасць многіх партыйных арганізацый і работнікаў абышлася дорага і нанесла шкоду інтарэсам працоўных краіны Советаў.

Для таго, каб больш паспяхова змагацца з ворагамі і больш паспяхова вырашаць усе задачы, таварыш Сталін высунуў лозунг аб палітычным выхаванні кадраў, аб авалоданні большэвізмам, аб авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Ленін вучыў партыю, што «без рэвалюцыйнай тэорыі не можа быць і рэвалюцыйнага руху», што **«роль перадавога барацьбіта можа выконваць толькі партыя, кіруемая перадавой тэорыяй».**

Самай перадавой тэорыяй рабочага руху, найвышэйшым дасягненнем чалавечай культуры з'яўляецца марксізм-ленінізм.

Марксісцка-ленінская тэорыя асвятляе шлях практыцы, дазваляе зразумець унутраную сувязь акружаючых падзей, дае магчымасць арыентавацца ў абстаноўцы і прадбачыць, як і куды будуць развівацца падзеі.

Марксісцка-ленінская тэорыя ёсць не догма, а кіраўніцтва к дзеянню, а гэта значыць, што марксізм-ленінізм ёсць творчае вучэнне і, як усякая навука, на аснове вопыта рэвалюцыйнага руху развіваецца, рухаецца наперад, узбагачаецца новымі палажэннямі і вывадамі, замяняе некаторыя палажэнні і вывады, не адпавядаючыя новай гістарычнай абстаноўцы.

Авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй гэта не значыць завучыць напамяць некаторыя палажэнні і вывады, супакоіцца на гэтым і карыстацца імі ўсё жыццё.

Авалодаць марксізмам-ленінізмам гэта значыць усвоіць сутнасць марксізма-ленінізма, умець прымяняць яго на практыцы, развіваць тэорыю, рухаць яе наперад.

«Можна сказаць без пераўвелічэння, што пасля смерці Энгельса найвялікшы тэарэтык Ленін, а пасля Леніна—Сталін і іншыя вучні Леніна — былі адзінымі марксістамі, якія рухалі наперад марксісцкую тэорыю і ўзбагацілі яе новым вопытам у новых умовах класавай барацьбы пролетарыята». («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»).

Таварыш Сталін бесперастанна вучыць нас, што калі не кіравацца тэорыяй, не глядзець наперад, то акалічнасці будуць штурхаць сёння ў адну старану, заўтра ў другую, а паслязаўтра папягнуць назад. Вось чаму партыя прад'яўляе зараз да кадраў патрабаванне — калі хочаш па-сапраўднаму кіраваць, авалодай тэорыяй, бо задача правільнага кіраўніцтва усімі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе авалодання ад практыкаў асновамі марксісцка-ленінскай тэорыі.

Вось гэта самая патрэбная і самая неабходная работа па абучэнню нашых партыйных і беспартыйных кадраў большэвізму і разгортваецца ў даны час ва ўсёй нашай краіне, у сувязі з выхадам у свет «Кароткага курса гісторыі Усесаюзнай Комуністычнай партыі большэвікоў» і апублікаваннем пастановы ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» — сапраўды навуковай гісторыі большэвізма—з'яўляецца буйнейшай падзеяй для партыі і краіны.

Гэта праца паявілася ў рэзультаце велізарнай тэарэтычнай работы, праробленай камісіяй ЦК ВКП(б), асабіста таварышам Сталіным, і з'яўляецца велізарным укладам у скарбніцу марксісцка-ленінскай тэорыі.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» узбройвае нашы кадры веданнем законаў грамадскага развіцця і палітычнай барацьбы, узбройвае іх большэвізмам, з'яўляецца сродкам далейшага ўмацавання нашых радоў, павышэння большэвіцкай пільнасці, умацоўвае ў партыйных і непартыйных большэвікоў упэўненасць у канчатковай перамозе комунізма.

Усё гэта азначае новае велізарнае ўзмацненне нашай партыі, нашай дзяржавы, усёй нашай справы.

За пятнаццаць год, прайшоўшыя пасля смерці Владзіміра Ільіча Леніна, наша партыя, ачысціўшая свае рады ад прабраўшыхся ў яе двурушнікаў, ад засланых у яе рады правакатараў і агентаў імперыялістычнай буржуазіі, стала такой моцнай і маналітнай, як ніколі.

Непераможная сіла нашай партыі заключаецца ў яе бязмежнай вернасці і адданасці марксізму-ленінізму.

Вось чаму такі бязмежны аўтарытэт нашай партыі ў народзе, такая глыбокая любоў народа да партыі Леніна—Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

### IX.

26 студзеня 1924 года на другім Усесаюзным з'ездзе Советаў, у гэтай самай зале,—таварыш Сталін ад імені партыі даў вялікую клятву — поўнасцю ажыццявіць заветы Леніна.

Таварыш Сталін пакляўся ў тым, што партыя будзе

трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі;

захоўваць адзінства нашай партыі, як зяніцу вока;

захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята;

умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян;

умацоўваць і расшыраць Саюз Рэспублік;

умацоўваць нашу Чырвоную Армію, наш Чырвоны Флот;

умацоўваць і расшыраць саюз працоўных усяго свету — Комуністычны Інтэрнацыянал.

Вялікая клятва выканана. **(Бурныя апладысменты).**

Галоўным ітогам пятнаццаці год, прайшоўшых з дня канчыны Владзіміра Ільіча Леніна, з'яўляецца той, што ў нашай краіне пабудаван сацыялізм, што сацыялізм «ужо ўвайшоў у быт, у штодзённы быт народа... пранізвае ўсё жыццё народа». **(Сталін).**

А гэта і азначае выкананне асноўнага завета Леніна.

Перад нашай партыяй і нашай краінай стаяць многія складаныя, яшчэ не вырашаныя задачы. Барацьба партыі—перадавога атрада працоўных СССР — за ўмацаванне і развіццё сацыялізма, за канчатковае пераадаленне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і сазнанні людзей, за пераўтварэнне сацыялістычнага грамадства ў комуністычнае — яшчэ не закончана. Краіне пераможнага сацыялізма прадстаяць рашаючыя баі з капіталістычным акружэннем і ў першую чаргу з фашысцкімі агрэсарамі, рыхтуючымі напад на Совецкі Саюз.

Але пры той умове, што партыя разумее ўсю труднасць стаячых перад краінай задач, што яна не дазваляе захапляцца поспехамі і не дапускае галавакружэння, вучыць працоўных бачыць ценявыя бакі поспехаў, штодзенна мабілізуе працоўных на пераадаленне труднасцей, — няма сумнення, што ўсе яшчэ пакуль не вырашаныя задачы будуць вырашаны.

Перад совецкім народам ясная і прамая дарога. Працоўныя нашай краіны цвёрда пераканаты, што сацыялізм, грамадскі лад больш высокі і прадукцыйны, чым капіталізм, сацыялізм, — які знішчыў эксплаатацыю чалавека чалавекам, падняў народы да сапраўднага чалавечага жыцця, распраміў спіны мільёнаў, — непераможны.

Працоўныя нашай краіны цвёрда ведаюць, што капіталізм і фашызм павінны загінуць — такава гістарычная законамернасць.

Але працоўныя ў той-жа час не забудуць слоў Леніна аб тым, што капіталізм не «ўпадзе», калі яго не «ўроняць».

Пад сцягам Леніна—Сталіна ўсёй сваёй далейшай дзейнасцю будзем набліжаць гэты момант.

Не адступаць ні на крок ад Ленінскіх заветаў!

Высока і пераможна трымаць сцяг марксізма-ленінізма!

Ва ўсім следаваць Леніну! Ва ўсім следаваць Сталіну! **(Апладысменты).**

Ва ўсім быць такімі, як Ленін, як Сталін! **(Апладысменты).**

І тады ў надыходзячых рашаючых баях з капіталістычным акружэннем, — перамога напэўняка будзе за намі.

Справа Леніна—Сталіна перамагла ў нашай краіне!

Справа Леніна—Сталіна пераможа ва ўсім свеце! **(Бурныя, доўга незмаўкаўшыя апладысменты. Аркестр выконвае «Інтэрнацыянал»).**

# ВАЛЕРЫЯН ВЛАДЗІМІРАВІЧ КУЙБЫШЭЎ

**(Да 4-й гадавіны з дня смерці)**

25 студзеня 1935 года абарвалася жыццё выдатнага пролетарскага рэвалюцыянера, адданага і мужнага большэвіка, сына вялікай партыі Леніна—Сталіна Валерыяна Владзіміравіча Куйбышава.

Усё сваё жыццё, усю сілу свайго розуму і сэрца аддаў без астатку Валерыян Владзіміравіч Куйбышаў справе рабочага класа, справе сацыялізма. Трацкісцка-бухарынскія найміты фашысцкіх развэдак, з якімі ўсё сваё жыццё змагаўся большэвік Куйбышаў, задумалі і ажыццявілі подлае забойства Валерыяна Владзіміравіча. Подлыя забойцы Кірава, Менжынскага, Горкага, Куйбышава панеслі заслужаную кару, совецкі народ сцёр іх з твару нашай шчаслівай зямлі. А вобраз В. В. Куйбышава, яго неўміручыя справы будуць вечна жыць у памяці кожнага совецкага патрыёта.

***

У сваёй выдатнай паэме «Хорошо» Маякоўскі раіў нашай моладзі:

Юноше,
обдумывающему житье,
решающему—
сделать бы жизнь с кого,
скажу
не задумываясь:
— Делай ее
с товарища
Дзержинского.

Такім-жа ўзорам, такім-жа прыкладам гераічнага служэння радзіме з'яўляецца для совецкага народа і жыццё В. В. Куйбышава. Шаснаццацігадовым юнаком уступіў Валерыян Владзіміравіч у 1904 годзе ў большэвіцкую арганізацыю гор. Омска. У 1905 годзе, у бурныя дні першай рэвалюцыі Куйбышаў вядзе падпольную работу ў Петраградзе, выконваючы адказныя даручэнні большэвіцкай партыі па перавозках і хаванню зброі, па распаўсюджванню партыйнай літаратуры. Затым ён пераязджае ў Омск і кіруе там забастоўкай рабочых чыгуначных майстэрняў.

Не раз арыштоўвала царская ахранка нястомнага большэвіка Куйбышава, але як толькі ён вырываўся на волю, ён па-ранейшаму мужна і гераічна прадаўжаў рэвалюцыйную работу. Калі царскі ўрад высылае Куйбышава ў 1910 годзе у Нарымскі край, ён разам з Я. М. Свердловым скалачвае з палітычных ссыльных моцнае большэвіцкае ядро і вядзе сярод іх вялікую прапагандысцкую работу.

Невычарпальнай бадзёрасцю і верай у блізкую перамогу рэвалюцыі гучаць вершы, напісаныя В. В. Куйбышавым у ссылцы:

Гей, друзья! вновь жизнь вскипает,
Слышны всплески здесь и там,
Буря, буря наступает,
С нею радость мчится к нам.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 года застала В. В. Куйбышава на шляху ў Туруханскую ссылку. Ён вяртаецца з ссылкі і неўзабаве становіцца арганізатарам Совецкай улады ў Самары. З таго часу і да канчатковага разгрому белагвардзейскай контррэвалюцыі і інтэрвентаў партыя кідае Валерыяна Владзіміравіча на самыя адказныя ўчасткі грамадзянскай вайны. Член Рэвалюцыйнага Ваеннага Совета паўднёвай групы Усходняга фронта, адзін з арганізатараў разгрому Калчака, член Рэвалюцыйнага Ваеннага Совета XI арміі, удзельнік вызвалення Сярэдняй Азіі — большэвіцкі палкаводзец Куйбышаў не ведае стомы ў барацьбе з ворагамі совецкага народа.

Як толькі партыя прыступіла да мірнага сацыялістычнага будаўніцтва, Куйбышаў быў назначан членам прэзідыума ВСНГ і кіраўніком усёй электрычнай прамысловасці. У перыяд самай жорсткай барацьбы з трацкісцка-правымі рэстаўратарамі капіталізма партыя паслядоўна ставіць свайго вернага сына В. В. Куйбышава на пост сакратара ЦК ВКП(б), старшыні Вышэйшага Совета Народнай Гаспадаркі, кіраўніка рэарганізаванай па ўказаннях Леніна ЦКК — РСІ, старшыні Дзяржплана. З 1927 года В. В. Куйбышаў з'яўляўся членам Палітбюро ЦК ВКП(б).

Подлыя ворагі народа абарвалі цудоўнае, поўнае гераічнага служэння партыі жыццё выдатнага вучня Леніна і Сталіна, буйнейшага арганізатара і кіраўніка дзяржаўнага і гаспадарчага будаўніцтва нашай краіны. Але справы Куйбышава жывуць у вялікіх перамогах комунізма, у росквіце нашай радзімы, у подвігах вялікага совецкага народа. Пройдуць годы, магілы забойцаў Куйбышава зарастуць бур'янам, а імя Валерыяна Владзіміравіча перажыве стагоддзі.



У бліжэйшыя дні ў Трэцьякоўскай галерэі (Масква) адкрываецца выстаўка рускага гістарычнага жывапісу.

НА ЗДЫМКУ: Карціна мастака В. М. Васнецова «Багатыры», 1898 г. (Экспанат выстаўкі. Рэпрадукцыя фота хронікі ТАСС).

# НА ПАСЯДЖЭННІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ШЭЎЧЭНКАЎСКАГА КАМІТЭТА

21 студзеня ў Доме пісьменніка пад старшынством прэзідэнта Акадэміі навук БССР тав. Горэва адбылося пасяджэнне рэспубліканскага Шэўчэнкаўскага камітэта.

Камітэт абмеркаваў рад пытанняў падрыхтоўкі да юбілея вялікага украінскага паэта-дэмакрата.

Інстытут літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР рыхтуе навуковую канферэнцыю, прысвечаную юбілею Шэўчэнка. Даклад аб жыцці і творчасці паэта зробіць праф. М. Дабрынін. Па пытанню аб значэнні творчасці Тараса Шэўчэнка ў развіцці украінскай літаратурнай мовы выступіць прадстаўнік Украінскай ССР.

Для перыядычнага друку навуковымі работнікамі АН БССР рыхтуюцца артыкулы: «Шэўчэнка і творчасць Якуба Коласа» (Ларчанка), «Шэўчэнка і творчасць Янкі Купалы» (Барысенка), Шэўчэнка і беларуская народная творчасць» (Грынблат) і інш.

Для правядзення дакладаў аб жыцці і творчасці Шэўчэнка на заводах, фабрыках, у калгасах, соўгасах і навучальных установах вылучана брыгада работнікаў Інстытута літаратуры і мовы, у якую ўваходзяць т. т. Дворкіна, Фіглоўская, Ларчанка, Маслоўскі, Грынблат.

Рыхтуецца вечар работнікаў Акадэміі навук, на якім беларускія паэты і пісьменнікі выступяць з чыткай твораў Шэўчэнка ў перакладзе на беларускую мову.

Беларускімі кампазітарамі напісаны песні на тэксты Шэўчэнка. Да дня юбілея выходзіць з друку «Кабзар» Т. Г. Шэўчэнка ў перакладзе беларускіх паэтаў. У журнале «Полымя рэвалюцыі» друкуюцца дзве навелы украінскага пісьменніка Хазан, прысвечаныя Шэўчэнка, і п'еса М. Клімковіча, у якой паказваецца праезд вялікага паэта праз Беларусь. Мастакі БССР рыхтуюць к юбілею два партрэты Шэўчэнка.

Рэспубліканскі Шэўчэнкаўскі камітэт вырашыў выпусціць масавым тыражом серыю твораў Шэўчэнкі для дзяцей і выдаць паасобныя брашуры для калгаснай вёскі.

Камітэт вырашыў прасіць Менскі горсовет назваць імем Шэўчэнка адну з вуліц горада Менска. Камітэт вырашыў таксама прасіць Наркамасветы БССР назваць імем Шэўчэнка адну—дзве школы і на літаратурным факультэце Педагагічнага інстытута і ў мастацкім вучылішчы ўстанавіць дзве стыпендыі імя Шэўчэнка; прасіць СНК БССР пабудаваць у гор. Магілеве Дом культуры і мастацтваў імя Шэўчэнка.

Камітэтам вырашана арганізаваць выстаўку, прысвечаную Шэўчэнка, і агульнагарадскі літаратурны вечар.

**А. Б.**

# АГЛЯД КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫХ ТЭАТРАЎ БССР

У красавіку бягучага года ў Менску адбудзецца агляд калгасна-соўгасных тэатраў БССР. У аглядзе прымуць удзел 6 калгасна соўгасных тэатраў і Мозырскі абласны тэатр.

У бліжэйшыя дні ў калгасна-соўгасныя тэатры выязджаюць прадстаўнікі Упраўлення па справах мастацтваў для азнаямлення з работай гэтых тэатраў і аказання ім патрэбнай дапамогі.

У пачатку лютага пры Упраўленні па справах мастацтваў адбудзецца нарада кіраўнікоў калгасна-соўгасных тэатраў, прысвечаная агляду і ўсім пытанням, звязаным з работай калгасна-соўгасных тэатраў.

# БУДУ ПРАЦАВАЦЬ З ВАМІ ПА-САПРАЎДНАМУ

**Адказ на адкрытае пісьмо калектыва самадзейнасці цырульнікаў і работнікаў лазняў і пральняў.**

**Дарагія таварышы!**

Я з вялікім хваляваннем прачытаў ваша пісьмо ў газеце «Літаратура і мастацтва» ад 17 студзеня, у якім вы выказалі пажаданне, каб я кансульціраваў вашы гурткі мастацкай самадзейнасці. Многіх з вас я ведаю асабіста, як таленавітых удзельнікаў рабочай самадзейнасці, і не раз сустракаўся з вамі па рабоце.

Па пытанню аб шэфстве над вашымі гурткамі я хачу выказаць такую думку: я не прыхільнік «кансультацый», інакш кажучы — гастралёрства. Чалавек прыходзіць, праслухае выканаўцаў раз у месяц, выкажа сваю думку і... на гэтым справа канчаецца. Я, калі бяруся за справу, люблю працаваць па-сапраўднаму. Такую работу я праводжу на працягу раду год з пагранічнікамі.

На адну з вашых бліжэйшых рэпетыцый я прыду і там мы дамовімся аб метадах нашай работы.

З прывітаннем **І. ЛЮБАН.**

# У ДРАМСЕКЦЫІ ССП БССР

24 студзеня адбылося пашыранае пасяджэнне бюро секцыі драматургаў ССП БССР. Драматургі пазнаёмілі членаў секцыі са сваімі новымі работамі.

Тав. Бядуля працуе над новай п'есай, прысвечанай совецкім людзям калгаснай вёскі.

Закончыў сатырычную камедыю тав. Крапіва. У сваёй новай п'есе аўтар выкрывае паклёпнікаў і авантурыстаў. якія шэльмуюць часных совецкіх людзей. Камедыя знаходзіцца на кансультацыі. Пасля невялікіх дапрацовак драматург падрабязна пазнаёміць з ёю ўсіх членаў секцыі.

Вызваленне Беларусі ад белапалякаў будзе адлюстравана ў п'есе тав. Клімковіча. У гэтым творы ўпершыню ў беларускай літаратуры будуць паказаны вобразы геніяў чалавецтва — Владзіміра Ільіча Леніна і Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Аўтар пакажа ў сваёй п'есе ролю вялікіх стратэгаў рэволюцыі ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

П'есу аб совецкім пагранічны заканчвае тав. Гурскі. Чарнавы варыянт твора напісан. Аўтар прачытае п'есу пісьменнікам у пачатку лютага.

Маладыя паэты тт. Жаўрук і Ушакоў пішуць лібрэта для музычнай камедыі аб жыцці беларускага калгаса. Паколькі аўтары ўпершыню працуюць у жанры драматургіі, яны звярнуліся ў драмсекцыю з просьбай, каб ім дапамаглі ў справе аўладання гэтым складаным жанрам. Драмсекцыя вылучыла кансультантам да іх драматурга тав. Крапіву. Музычная камедыя, над якой працуюць тт. Жаўрук і Ушакоў, прызначаецца для мастацкай самадзейнасці горада і вёскі.

Аб мастацкай інтэлігенцыі піша п'есу тав. Рамановіч. Чарнавы варыянт напісан. Аўтар робіць нэкаторыя дапрацоўкі.

Маладому совецкаму аграному, які змагаецца за павышэнне соцыялістычных ураджаяў, прысвечана п'еса тав. Паслядовіча. Не гледзячы на тое, што аўтару перашкаджаюць сваімі блытанымі парадамі шматлікія «кансультанты» Віцебскага драмтэатра, ён усё-ж мяркуе ў лютым закончыць п'есу.

Цікавую п'есу аб слаўнай сям'і совецкіх чыгуначнікаў напісаў тав. Шынклер. У гэтай п'есе паказваецца, як совецкія патрыёты выкрылі шкоднікаў на чыгунцы. У рабоце над п'есай аўтару шмат дапамог мастацкі кіраўнік ТЮГ'а тав. Міровіч.

Яўрэйскія пісьменнікі тт. Аксэльрод і Э. Каган пішуць п'есу паводле твораў класіка яўрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер-Сфорым.

Над бытавой камедыяй працуе тав. Ільінскі.

Малады драматург тав. Рудзько пачаў работу над новай п'есай, у якой будзе паказана палітычнае выхаванне моладзі.

Многія драматургі скардзіліся на пасяджэнні на тое, што яны перагружаны рознай работай, якая перашкаджае іх асноўнай творчай рабоце. Асабліва шмат гаварыў аб перагружанасці тав. Міровіч, які з-за перагружанасці не можа закончыць напісаную ўжо п'есу. А тав. Міровіч мог-бы шмат дапамагчы Тэатру музкамедыі БССР у стварэнні лібрэта для совецкай аперэты.

Секцыя выказала думку аб тым, што праўленне ССП БССР і Упраўленне па справах мастацтваў павінны прыняць усе захады да стварэння драматургам умоў для работы над новымі п'есамі.

З інфармацыяй аб падрыхтоўцы да дэкады беларускага совецкага мастацтва ў Маскве выступіў тав. Юдэлевіч. Ён паведаміў, што дэкада адбудзецца ўвосені бягучага года. Драматургам неабходна зараз-жа прыступіць да напісання новых п'ес для тэатраў БССР, а таму трэба арганізаваць работу драматургаў. Упраўленне па справах мастацтваў прыступае да заключэння ўмоў з драматургамі, якія будуць працаваць над п'есамі, прызначанымі для паказу на дэкадзе.

Выступаўшыя ў спрэчках тт. Клімковіч, Гурскі, Рамановіч і Модэль выказаліся за тое, каб прыцягнуць для напісання п'ес больш шырокі круг аўтароў. Тав. Клімковіч выказаў пажаданне, каб у п'есах, якія мяркуюцца да паказу на дэкадзе, была адлюстравана тэма росту рабочага класа БССР, бо да гэтага часу вобраз рабочага ў беларускай драматургіі яшчэ не паказан.

Неабходна паказаць вобразы любімых правадыроў працоўных — таварышоў Леніна і Сталіна, якія стварылі Беларускую рэспубліку. Трэба напісаць п'есы аб саратніках Леніна і Сталіна, якія працавалі на тэрыторыі Беларусі, — аб Кагановічу, Ежове, Фрунзе. На гэтым пытанні спыніўся ў сваім выступленні тав. Гурскі.

Трэба адзначыць, што ўсе драматургі БССР зараз працуюць над новымі п'есамі. Гэта ўжо зарука таго, што да дэкады ў Маскве ў нас будуць напісаны новыя п'есы.

Намечана правесці ў лютым рад творчых вечароў, чытак і абмеркаванняў твораў драматургаў: кіно-сцэнарыя Н. Таубе «Сябры расставаліся» і п'ес П. Глебкі і Хв. Шынклера. Намечана сустрэча драматургаў з народнымі і заслужанымі артыстамі БССР. Дзесяць драматургаў камандыруюцца ў Маскву для прагляду спектакляў МХАТ і Малага тэатра.

**А. Е.**



У бліжэйшыя дні ў Трэцьякоўскай галерэі (Масква) адкрываецца выстаўка рускага гістарычнага жывапісу.

НА ЗДЫМКУ: Карціна мастака В. В. Верэшчагіна «Са зброяй у руках! Расстраляць!». (Экспанат выстаўкі. Рэпрадукцыя фотахронікі ТАСС).

САТЫРА І ГУМАР

# ЧАРГОВАЕ АБГАВАРЭННЕ

Учора позна ўвечары ў Доме пісьменніка драматург прачытаў сваю новую п'есу.

Доўга цягнулася мучыцельная пауза. Здавалася, чорная кошка прабегла паміж чакаючым уражання аўтарам і людзьмі, заклікаными выказаць гэта ўражанне.

У глыбокім раздум'і, уставіўшы вочы ў «потолок дерзаний» сядзеў Г. Бярозкін. Адсутнічаючым позіркам абменьваліся Ф. Міхайлаў, М. Майсееў і Н. Андрэеў. Штосьці таямнічае шаптаў на вуха драматургу М. Модэль. Нецярпліва мітусіўся А. Кучар, энергічна калмацячы не паспеўшую пасівець шэвялюру.

Драматург цярпліва чакаў.

Ззяюча ўсміхаўся М. Ларчанка. Глыбокадумна церабіў бародку В. Вольскі.

Драматург настойліва чакаў.

Са ўздыхам парушыў паузу А. Кучар.

— Дык вось, таварышы, развіваючы ўдала знойдзены мною ў архівах газет тэзіс аб ілюстрацыйнай літаратуры, я павінен адзначыць дасягненне аўтара. І гэта дасягненне ставіць яго, безумоўна, у рад. І нам радасна адзначыць, што таварыш, які ішоў трынаццатым, зараз можа смела стаць у другую шарэнгу, я лічу — сёмым правафланговым. Вы паглядзіце, якія дэталі, які ўдзячны матэрыял, якія знаходкі! Актор можа стварыць манументальнейшы вобраз, калі ён па-сапраўднаму і глыбока пранікне хаця-б у такую характарыстыку персанажа, дадзеную аўтарам: у героя левы вус быў ледзь-ледзь цямней за правы. Удумайцеся: ледзь-ледзь! Канешне, актор можа ў сваім захапленні згусціць фарбы і тады загіне вобраз. Але трэба зразумець гэтае «ледзь-ледзь» і ўвасобіць яго, паставіць у залежнасць ад асноўных падзей твора. Асабліва гэта патрэбна памятаць актору ў фінале, калі герой садзіцца ў поезд. Гэта будзе страшна і патрасаюча.

Пальшчоны выступленнем А. Кучара, аўтар папрасіў выказаць свае меркаванні Ф. Міхайлава, М. Майсеева, Н. Андрэева. Але вышэйназваныя крытыкі хорам заявілі:

— Няхай Модэль, мы пасля!

— Я скажу коратка, — пачаў Модэль. — Давайце паглядзім на твор праз прызму. Вы заўважылі, таварышы, што ў парцітуры аўтара няма галоўнай магістралі? Сварку галоўнага героя з абаяльнай хатняй работніцай з-за прымуса і нечаканы ад'езд героя ў кур'ерскім поездзе ў камандыроўку мы не можам назваць галоўнай, спецыфічнай магістраллю, раскрываючай філасофію вобраза. Гэта хутчэй чыгуначная магістраль! Яна-б яшчэ глыбей прайшла праз твор, калі-б герой паехаў не на кур'ерскім, а на таварапасажырскім поездзе. І гэту магістраль можна рашыць класічнымі пуантамі, хваляпадобнай лірыкай арабескаў і аціцюдаў, шляхам па шасэ і кабрыолей, бо замысел у аўтара быў глыбокі і ён можа быць здзейснен толькі сродкамі балета. Тады загучыць уся абаяльнасць, мілагучнасць і свежасць галасавога тэмбру. Я павінен супярэчыць Кучару, які паставіў аўтара ў другую шарэнгу. Нельга так лёгка, таварыш Кучар, вырашаць важнейшыя аргмерапрыемствы драмсекцыі! У заключэнне, адзначаючы наяўнасць багацця сцэнічных кропак у творы, хочацца ўказаць на адсутнасць сцэнічных косак і клічнікаў. Яшчэ мне здаецца, што аптымістычны тонус п'есы выйграў-бы, калі-б аўтар адмовіўся ад абяскрыленай інтэрпрэтацыі ілюзорнага экспазіравання, а ўсё дзеянне падпарадкаваў-бы квінтэсэнцыі каларыстычных сцэнак.

Зноў запанавала цішыня. Драматург пытальным позіркам акінуў Міхайлава, Майсеева і Андрэева.

Яны жвава заўважылі:

— На сёнешні дзень мы цалкам далучаемся да Модэля.

Рэпліка з кутка:

— А на заўтрашні?

Адказу не паследавала. Вышэйназваныя крытыкі ўпалі ў раздум'е. Слова папрасіў Г. Бярозкін.

— Драматург прыстрасны да павярхоўных эфектных сітуацый. Навошта яму спатрэбілася натуралістычнае карыстанне рэчамі і мёртвымі прадметамі? Успомніце, герой, едучы ў камандыроўку, бярэ з сабою вядомы ўжо нам нашумеўшы прымус. Зусім не апраўдана сцэна праводзін героя хатняй работніцай пасля сваркі. Дарэчы, чаму ён сварыцца з хатняй работніцай, калі была яўная прычына для сваркі з суседам, аб якім толькі ўспамінае аўтар, не развіваючы вобраза? У п'есе абсалютна не раскрыт эмацыянальны падтэкст, не паказан водараздзел чалавечых характараў. І наогул п'еса не тэатральная, не красачная, не пампезная. Калі аўтар зразумеў мае думкі, ён здолее дзярзаць.

З падрыхтаванымі і навукова абгрунтаванымі тэзісамі выступіў М. Ларчанка.

— Асноўным недахопам абгаварваемай п'есы, — сказаў ён, — з'яўляецца тое, што ў большасці персанажныя вобразы, падкрэсліваю п е р с а н а ж н ы я в о б р а з ы, абрысаваны сухавата, бледнавата і цьмянавата. Кожны вобразны персанаж з'яўляецца, безумоўна, па-свойму дзелавітым — узяць хаця-б падрыхтоўку героя да снедання. Аднак, інтымныя перажыванні не адлюстраваны мастацкімі сродкамі. У п'есе не абгрунтавана інтымнасць сваркі героя з хатняй работніцай. Сямейна-бытавы бок жыцця чалавека мала цікавіць аўтара і гэта ім упарта ў абрысоўцы персанажных вобразаў ігнарыруецца. Але ўвогуле п'еса багата цікавымі падзеямі, цікавымі сітуацыямі, інтрыгамі, завязкамі, нечаканымі развязкамі і падвязкамі, што робіць яе захапляючай.

Спіс аратараў быў вычарпан, за выключэннем аднаго. І аўтар паглядзеў у бок, дзе сядзеў В. Вольскі, але ўбачыў толькі пусты стул з накінутай на ім запіскай. Запіска не агалашалася і яе змест застаўся вядомым толькі аднаму драматургу.

Ён устаў з-за стала і з пачуццём найвялікшай удзячнасці паціснуў кожнаму з прысутных руку, потым накіраваўся ў тэатр, дзе яго даўно чакаў дырэктар для падпісання дагавора аб прыняцці п'есы на бліжэйшую пастаноўку.

— Усё ў парадку! — сказаў драматург. — Абгаварылі!

— Я-ж вам казаў! — усклікнуў у захапленні дырэктар.

Запісалі **Спірыдон Той з Пелагеяй.**

# ВЕЧАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСКВЕ

Вялікую цікавасць да беларускай літаратуры, мастацтва, жывапісу праяўляе вялікі рускі народ. Буйнейшым сведчаннем гэтага з'яўляецца арганізацыя вечароў беларускай літаратуры ў Маскве. Вечары адбудуцца 29—31 студзеня г. г. Для ўдзелу ў літаратурных вечарах з Менска ў сталіцу краіны Советаў выязджае дэлегацыя з 25-ці чалавек. У складзе дэлегацыі народныя паэты БССР Янка Купала і Якуб Колас, пісьменнікі П. Броўка, П. Глебка, З. Бядуля, К. Крапіва, М. Клімковіч, І. Гурскі, З. Аксэльрод, І. Шапавалаў, Э. Агняцвет, А. Куляшоў, М. Паслядовіч, Я. Маўр, А. Кучар, Г. Камянецкі. засл. дзеяч маст. З. Азгур, мастакі В. Волкаў, Н. Пашкевіч, нар. арт. рэсп. Л. Александроўская, засл. арт. рэсп. М. Дзянісаў, І. Балоцін, арт. Руч'ёва, кампазітары І. Любан, Н. Шчэглоў.

Даклад аб беларускай літаратуры зробіць на вечары ў Доме пісьменніка СССР тав. Клімковіч. Вечары беларускай літаратуры адбудуцца на буйнейшых прадпрыемствах і ў Політэхнічным музеі ў Маскве.

Пісьменнікі і паэты выступяць з чыткай сваіх твораў. Я. Купала прачытае вершы «А хто там ідзе?», «Алеся», «Аб Сталіне—сейбіту—песня мая». Я. Колас прачытае вершы «Вусцінскі грудок», «Сталіну» і лірычныя вершы. Паэтэса Э. Агняцвет прачытае вершы «Саколік», «Маці», урывак з паэмы «Фелікс Дзяржынскі». Аркадзь Куляшоў прачытае паэму «Васіль Баранаў», вершы «Бацька», «Маладосць», «Дружба» і інш. Яўрэйскі паэт З. Аксэльрод прачытае вершы «Аб Маскве», «Новы год», паэт Г. Камянецкі—«Расставанне», «Вясна ў раёне». Пісьменнік К. Крапіва прачытае байкі «Кувала», «Пажарны».

Артысты выканаюць народныя песні і песні, напісаныя беларускімі кампазітарамі на тэксты беларускіх пісьменнікаў. Нар. арт. рэсп. Л. Александроўская выканае арыю Марыські з оперы Цікоцкага «Міхась Падгорны», песні «Восень», «Бывайце здаровы», «Шаўковы паясок»—Любана, засл. арт. рэсп. І. Балоцін выканае народныя песні «Ой, ляцелі гусі»—у апрацоўцы Туранкова і «Жытцо»—у апрацоўцы Шчэглова.

У Доме совецкага пісьменніка арганізуецца выстаўка беларускага жывапісу. Будуць прадстаўлены карціны мастака Я. Кругера «Сталін слухае даклад», «Касар», «Калгаснік-яўрэй», мастака В. Волкава—«Партрэт Леніна» і «Дзяўчынка», акварэлі Лейтмана, работы мастакоў Пэна, Ахрэмчыка, Пашкевіча.

# 30-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ МАСТАКА В. В. ВОЛКАВА

Для падрыхтоўкі і правядзення 30-гадовага юбілея мастацкай і грамадскай дзейнасці мастака В. В. Волкава пры Упраўленні па справах мастацтваў створана камісія ў складзе тт. Рубінштэйна (старшыня), Керзіна, Зайцава і Геніна.

# КАНЦЭРТЫ АРТЫСТАЎ БРАТНІХ РЭСПУБЛІК

29—30 студзеня ў Менску адбудуцца два канцэрты народнай артысткі СССР ордэнаносца Ксеніі Георгіеўны Дзержынскай — салісткі Маскоўскага ордэна Леніна Вялікага акадэмічнага тэатра.

5—6 лютага вядомы камерны спявак праф. Даліво дасць два канцэрты ў Менску.

З 10 лютага ў БССР прыедзе на гастролі вядомы выканавец яўрэйскіх народных песень Міхаіл Эпельбаум. Першыя канцэрты адбудуцца ў Менску.

6 канцэртаў у БССР дасць з 22 да 28 лютага лаўрэат міжнароднага конкурса скрыпачоў ордэнаносец праф. Давід Ойстрах.

У сакавіку на 15—20 гастролей у БССР прыедзе «Евоканс» (яўрэйскі вакальны ансамбль Украіны) пад кіраўніцтвам засл. арт. рэсп. Шайніна.

# „ЦІ НЕ ДАСТАТКОВА ПАПРАСІЦЬ ПРАБАЧЭННЯ?“

## Аб працоўнай дысцыпліне ў Дзяржаўнай філармоніі БССР

Да новага, 1939 года, правільней кажучы, да пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС «Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага соцыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе» ў Дзяржаўнай філармоніі БССР было ўсё ціха і спакойна. На прагульшчыкаў, лодыраў і парушальнікаў працоўнай дысцыпліны ніхто не звяртаў увагі. Прагулы, спазненні, зрывы заняткаў і канцэртаў былі ў парадку рэчаў.

Пасля пастановы партыі і ўрада аб працоўнай дысцыпліне да прагульшчыкаў і тых, хто спазняецца на работу, пачалі прыглядацца, пачалі рэгістрыраваць прагулы. Пасля гэтага ўсе «заўважылі», што з працоўнай дысцыплінай у Філармоніі не ўсё добра.

За першую дэкаду студзеня былі зняты з работы прагульшчыкі—баяніст ансамбля песні і пляскі Шчэрбінскі, музыкант аркестра народных інструментаў Дзелендзік, работнік аховы Адамовіч, атрымалі вымовы за спазненне на работу Ламака, Пятровіч і інш.

Чым-жа растлумачыць, што і **пасля** пастановы партыі і ўрада колькасць прагулаў і спазненняў у Дзяржфілармоніі вельмі вялікая?

На агульным сходзе работнікаў Філармоніі 19 студзеня па гэтаму пытанню можна было пачуць розныя думкі. Адны лічылі, што да пастановы партыі і ўрада прагулаў і спазненняў у Філармоніі было яшчэ больш, а таму дзесятак-паўтара прагулаў і спазненняў за дэкаду трэба лічыць ужо «дасягненнем». Другія-ж указвалі, што сярод работнікаў Філармоніі ёсць група людзей, якая наогул не лічыцца ні з якімі законамі.

Нам здаецца, што больш за ўсіх меў падстаў старшыня мясцкома Філармоніі тав. Салабуцін, калі ён, у парадку самакрытыкі, заявіў: «Прычына прагулаў і спазненняў крыецца ў тым, што мы прапрацавалі пастанову партыі і ўрада на-хаду, у часе перапынкаў».

Выступленні на сходзе толькі пацвердзілі, што многія работнікі калектыва Філармоніі не зусім добра ўсвядомілі змест і значэнне пастановы партыі і ўрада, а кіраўнікі Філармоніі не дапамаглі ім у гэтым. Паставіў жа хтосці зусім сур'ёзна пытанне на сходзе: «А калі прагульшчык папросіць прабачэння, то можна яму дараваць ці не?».

Ды і што гаварыць аб радавых работніках, калі некаторыя адміністратары Філармоніі не разумеюць (альбо не хочуць разумець?) зусім ясных і выразных указанняў Соўнаркома, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС. Напрыклад, адміністратар эстрады тав. Шэр разводзіць рукамі і «не ведае», як быць. Бачыце, «ёсць саліст, першая скрыпка, напрыклад; калі ён спозніцца на 20 мінут, яго трэба звольніць, а гэтым наносіцца шкода(!) прадпрыемству. Калі-ж яго не звольніць, то дырэктар пойдзе пад суд. Якжа быць?».

У неўразуменні знаходзіцца і адзін з кіраўнікоў ансамбля песні і пляскі тав. Сакалоўскі. Калі ўдзельніца ансамбля Шкатула спазнілася на заняткі, тав. Сакалоўскі звярнуўся да яе з «бацькоўскай» заўвагай: «Ну, што з табой рабіць? Старайся больш не спазняцца».

Што крыецца пад гэтай бесхрыбетнасцю, пад гэтымі хістаннямі: неразуменне альбо ігнарыраванне пастановы партыі і ўрада? Дырэктар Дзяржфілармоніі тав. Прагін у сваім дакладзе на сходзе не палічыў патрэбным спыніцца на гэтым моманце. Між тым, такія абыякавыя адносіны кіраўнікоў калектываў да парушэнняў працоўнай дысцыпліны — адно з асноўных зол.

Ніхто таксама не спыніўся і на радзе такіх прыкрых фактаў, калі дырэктар Філармоніі тав. Прагін, замест звальнення прагульшчыкаў, абмяжоўваецца вымовамі, пакідаючы прагульшчыкаў на рабоце (Пацкевіч, Пятровіч, Перспін).

Другім вялікім злом з'яўляецца вельмі дрэнная арганізацыя заняткаў і работы ў Філармоніі, што прыводзіць да велізарнага хаосу і беспарадку.

Вось што, напрыклад, расказала на сходзе артыстка хора тав. Нэйрос.

— Тры гады, г. зн. з першага дня арганізацыі, Філармонія працуе без плана. Усе мерапрыемствы праводзяцца ў «кампанейскім» парадку. Няма цвёрдых раскладаў заняткаў, рэпетыцый. Раніцою могуць абвясціць, што заняткі хора пачнуцца ў 6 гадзін вечара, а праз гадзіну могуць паведаміць, што яны пачнуцца ў 5 гадзін 30 мінут. Такім чынам той, хто чуў першую аб'яву, а не чуў другой, можа спазніцца на поўгадзіны. Няма пэўных дзён адпачынку. Раніцой не ведаеш, што будзеш рабіць увечары, а ўвечары — што будзеш рабіць заўтра.

— Рабочы дзень у нас «ненарміраваны», — расказвае ўдзельнік ансамбля песні і пляскі тав. Сляпой. — Адзін дзень працуеш пяць гадзін, другі — тры, трэці — чатыры. У карыдоры вісіць расклад: ад 9 да 10 гадзін калектыў займаецца на базе, з 10 да 11 — у клубе імя Сталіна. А для таго, каб апрануцца, дайсці да клуба і распрануцца, патрэбна мінімум 20 мінут. Такім чынам расклад загадзя стварае абстаноўку для спазненняў...

— Як сачыць за часам, калі ў Філармоніі няма гадзінніка? — пыталіся многія. Некаторыя інспектары, абавязаныя сачыць за прыходам на работу, не маюць нават кішэнных гадзіннікаў. Адсюль шмат непаразуменняў. Некаторыя прыходзяць на работу па «сваіх гадзінніках», якія, як правіла, заўсёды «адстаюць» на 10—15 мінут.

Шмат часу трáціцца дарэмна і ў момант самой работы. Віяланчэліст тав. Сямёнаў, ён-жа старшыня профцэхкома, скардзіцца, што адсутнасць дысцыпліны ў часе работы — самае балючае месца. У аркестры, напрыклад, шмат часу трáціцца на «шум»: на рассаджванне, настройку інструментаў, непатрэбнае наігрыванне і г. д.

Але больш за ўсё скаргаў было на адсутнасць цвёрдага вытворчага плана работы, на няўпэўненасць у «заўтрашнім дні» і нават у «сёнешнім вечары».

Адсутнасць плана старшыня мясцкома тав. Салабуцін «растлумачыў» вельмі проста: «У дырэктара няма намесніка — таму няма плана (!?)».

Думаецца, што гэты матыў далёка не апраўдвае ні дырэктара тав. Прагіна, ні старшыню мясцкома тав. Салабуціна.

Вінаваты яны і ў тым, што да гэтага часу барацьба з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны насіла недастаткова сур'ёзны, хутчэй фармальны характар. Мала абмежавацца двума-трыма звальненнямі, некалькімі вымовамі. Кіраўнікам Дзяржаўнай філармоніі трэба давесці да свядомасці кожнага члена калектыва ўсё велізарнае **палітычнае** значэнне пастановы СНК, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС, трэба знішчыць усе недахопы, якія перашкаджаюць поўнасцю ажыццявіць дырэктывы партыі і ўрада.

**І. ПРАЎДЗІН.**

Адказны рэдактар **І. ГУРСКІ.**

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № Б—787.